Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 ЛІПЕНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 144 (29766)

СА ЖНІЎНЯ ВЫРАСТУЦЬ ПЕНСІІ 2

ЯКІЯ КВЕТКІ НЕ ВАРТА ТРЫМАЦЬ ДОМА? 11

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый ЛУЖЫНСКІ, намеснік генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробстве:

«Для Беларусі не так шмат трэба вырошчваць сельгаспрадукцыі, асабліва ў галіне раслінаводства, каб гарантаваць сваю харчовую бяспеку. Напрыклад, для таго каб забяспечыць усё наша насельніцтва хлебабулачнымі і кандытарскімі вырабамі і ўсімі відамі круп, — дастаткова 1 млн тон, а мы вырабляем толькі збожжавых 6-8 млн т кожны год. Астатняе збожжа ўсё ідзе на корм жывёле, і гэта дадатковая прадукцыя жывёлагадоўлі. Гэта значыць, нарошчваючы вытворчасць раслінаводчай прадукцыі, мы можам у далейшым больш атрымліваць жывёлагадоўчай прадукцыі. А так мы цалкам сябе забяспечваем усімі асноўнымі відамі харчавання, таму што вядуцца пастаянныя работы па развіцці сельскай гаспадаркі, па павелічэнні прадукцыйнасці працы і ўраджайнасці».

ЗАЛАТАЯ ЗОРКА ЗАЗЗЯЕ ЯРЧЭЙ

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

9 мая 1985 года ў газеце «Звязда» быў апублікаваны матэрыял пад назвай «Ззянне залатой зоркі», прысвечаны ўрачыстаму адкрыццю ў Мінску абеліска «Мінск — горад-герой»: «Побач з велічнай стэлай манументальная, у тры чалавечыя росты, постаць жанчыны з фанфарамі ў высока паднятай руцэ. Гэта Слава — сімвал Вялікай Перамогі. Здаецца, яшчэ гучыць на высокай ноце медзь труб, якія праспявалі выратаванаму свету, што фашызм звергнуты...»

Праз трыццаць сем гадоў спецыялісты ААТ «Белрэстаўрацыя» пачалі работы па рэстаўрацыі архітэктурна-скульптурнага ансамбля на скрыжаванні праспектаў Машэрава і Пераможцаў, які ўключае ў сябе абеліск «Мінск — горад-герой» і скульптуру «Слава Радзіме-маці».

СТАР. 8

КАРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, які дазваляе ўзаконіць самавольныя пабудовы.
- **Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Раніла Вікрамасінгхэ з перамогай на выбарах Прэзідэнта Шры-Ланкі.**
- Амаль 70 % тых, хто паступае ў БДУ, маюць сумарны бал, вышэйшы за 300.
- **Беларусь з пачатку бязвізу наведала каля 145 тысяч іншаземцаў.**

ISSN 1990 — 763X

«ВЯЛІКАГА ВАЛОДЗЮ З БЕЛАРУСІ» ВЕДАЛІ ЎСЕ

Сын аб легендарным бацьку

М. У. Рыжанкоў.

У 1990-я гады, калі пасля распаду СССР Беларусь атрымала незалежнасць, была выбудавана новая спартыўная сістэма. Найлепшыя напрацоўкі савецкай школы захавалі і спалучылі з новымі мадэлямі. Гэтая вялізная работа лягла на плечы Уладзіміра Мікалаевіча Рыжанкова, якога сёння можна справядліва лічыць першым спартыўным менеджарам Беларусі. Уладзімір Мікалаевіч дасканала ведаў савецкую сістэму спорту. Доўгі час працаваў у сістэме спартыўнага таварыства «Ураджай», у Спарткамітэце БССР. Каля шасці гадоў — у ЦК КПБ, курыраваў спорт, займаючыся пытаннямі кадравага забеспячэння і будаўніцтва спартыўнай інфраструктуры ў Беларусі. Уладзімір Мікалаевіч Рыжанкоў — заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту БССР. На пасадзе першага прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта ён вывеў беларускі спорт на міжнародную арэну. У гісторыю Беларусі ён увайшоў і як першы міністр спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.

СТАР. 4-5

Падаткі

ЗАКАНАДАЎСТВА ПАТРАБУЕ ЎЛІКУ ЎСІХ СУМ...

Па выніках года падатак больш за чатыры мільёны рублёў заплаціў беларус, які атрымліваў даходы з-за мяжы

Беларусы штогод прадстаўляюць у падатковыя органы дэкларацыю па падаходным падатку, калі ў справаздачным каляндарным годзе яны атрымалі даходы, якія падлягаюць падаткаабкладанню. Хто павінен прадставіць падатковую дэкларацыю за 2022 год і заплаціць падаходны падатак? Якія неабходна дэкларацыі даходы? Якія льготы прадугледжаны для розных катэгорый грамадзян? І якімі спосабамі прадстаўлення дэкларацыі і выплаты падаходнага падатку можна цяпер скарыстацца?

На гэтыя і іншыя пытанні на прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы адказаў начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах нашай краіны Андрэй КАВАЛЕЎСКІ.

СТАР. 7

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЗЯЛЁНЫ АСТРАВОК ПРЫРОДЫ Ў ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ ТРЭБА ЗАХАВАЦЬ ДЛЯ БУДУЧЫНІ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам начальніка Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Беларусі Юрыя Тэртэля

Першае пытанне, якое паставіў Прэзідэнт, — што трэба зрабіць для таго, каб інспекцыя была яшчэ больш эфектыўнай. Ён зрабіў акцэнт на дысцыпліну і ліквідацыю асноўных недахопаў. Некалькі гадоў таму, прызначаючы Юрыя Тэртэля начальнікам інспекцыі, Прэзідэнт указваў на неабходнасць забеспячэння дысцыпліны ў ведамстве і нават на наяўнасць фактаў карупцыі.

«Ваеннага чалавека туды і накіравалі, для таго каб парадак навесці. Наведзены парадак — як мы будзем рухацца ў гэтым плане? Тое, што мы павінны ўзмацніць работу па ахове жывёльнага, раслiннага свету, гэта факт. Зялёны астравок прыроды ў цэнтры Еўропы трэба захаваць для будучыні. І тут няма ніякай патэтыкі. Мы жывём у зеляніне, я маю на ўвазе нашу прыроду, хацелася б, каб і дзеці жылі ў такім жа свеце», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважыў, што інспекцыя — адносна ваенізаванае фарміраванне. Па яго словах, накіроўваючы туды ваеннага чалавека, ён меркаваў, што гэты складнік будзе ўзмоцнены. «Сустракаючыся тут з міністрам па надзвычайных сітуацыях, я яму даручыў, каб сярод моцных, надзейных мужыкоў (ты сам гэта разумееш не горш за мяне) мы маглі — не дай бог, цяжкія часы — стварыць добрае ваеннае падраздзяленне. Усё ж там служаць тысячы хлопцаў-ратавальнікаў. Яшчэ раз падкрэсліваю: гэта вельмі падрыхтаваныя, разумныя хлопцы. Мы дамовіліся, што на працягу некаторага часу (у прынцыпе, гэтае пытанне ўжо вырашанае) мы будзем мець там некалькі тысяч — на выпадак «калі» — падрыхтаваных байцоў. У цябе ўся інспекцыя павінна стаць пад ружжо, не дай бог. Таму гэты фактар таксама трэба мець на ўвазе», — сказаў ён.

Па словах беларускага лідара, пры неабходнасці інспекцыя будзе добраўпарадкавана, таксама трэба распрацаваць адпаведныя планы падрыхтоўкі супрацоўнікаў. Ён зрабіў акцэнт на тым, што людзей трэба вучыць. «Гэта не таму, што надзвычайшчына нейкая, але ўсе мы мужыкі, мы павінны быць да гэтага гатовыя. Ну а табе трэба навучыцца кіраваць гэтай арміяй. Калі, я кажу, раптам, не дай бог. Але вучэнні праводзіць трэба. Трэба, каб былі падрыхтаваныя людзі. Гэта зноў вопыт Украіны, калі схамянуліся і пачалі хапаць непадрыхтаваных людзей (там краіну развалілі яшчэ да пачатку гэтай аперацыі) — і на фронт. Яны толькі даязджалі да раёна баявых дзеянняў, і іх не стала. Яны не гатовыя былі насіць зброю. Нават насіць зброю, не тое што ваяваць. Таму нам трэба сваё грамадства ў той частцы, у якой нам неабходна, падрыхтаваць абараняць Айчыну», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Эфектыўнасць трэба павышаць новымі метадамі і формамі

Прэзідэнт нагадаў аб сваёй просьбе звярнуць увагу на аднаўленне лясоў: «У нас была вялікая праблема: высеклі — само зарасце. Ведаеш, як гэта бывае. Як тут звяртаў увагу, ці ўзяў пад кантроль?»

Прэзідэнт таксама пацікавіўся колькасцю людзей, якія працуюць у інспекцыі. Юрый Тэртэль адказаў, што працуе 549 чалавек. Па словах кіраўніка дзяржавы, такой колькасцю краіну не ахопіш, калі ісці адным фронтам і правяраць усё і ўсюды. «І колькасць мы асабліва павялічыць не зможам, асабліва цяпер, не да таго. Але эфектыўнасць трэба павышаць за кошт новых формаў і метадаў работы», — сказаў ён.

Асобна Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на праблему жорсткага абыходжання з жывёлінамі. Асабліва часта такія дзеянні з братамі меншымі дапускае моладзь. «Яшчэ адна праблема. Апошнім часам бачыш (прыбурэлай моладзі заўсёды хапала, і цяпер яна ёсць) здзек з жывёлін. Сярод моладзі асабліва. І ў інтэрнэт яшчэ выкладваюць», — заўважыў ён. Беларускі лідар даручыў неадкладна ўнесці прапановы, калі ў гэтым плане трэба дадаткова прымаць тыя ці іншыя рашэнні, хоць дадзеная сфера і не зусім профільная для дзяржінспекцыі. «Гэта ж таксама жывёліны. Самыя блізкія, надзейныя і прыстойныя жывёліны, якія ніколі не здрадзяць. А паглядзі, як асобныя людзі і моладзь (асобныя элементы) ставяцца да жывёлін. Гэта недапушчальна. Пакуль прымем закон (ён распрацоўваецца), я папрашу, прадумай, як інспекцыя па ахове зможа рэагаваць на такія праявы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што віноўнікаў такіх здарэнняў часам нават шукаць не трэба, бо ўсё гэта часта нахабна выкладваецца ў сацыяльныя сеткі. А беларусы, пераважная большасць, гэта людзі жаласлівыя. Яны да жывёлін добра ставяцца. І адразу ж праінфармуюць аб такіх негатыўных праявах.

«Нам трэба на гэта рэагаваць. Я папрашу, пакуль мы не выпрацуем закон, вазьмі гэта пад кантроль, наколькі гэта магчыма. Вось гэтыя абуральныя факты. То лебедзя там з нейкай рагаткі ці трызубцам нейкім застрэляць і здзекуюцца. Ну, лебедзь — свяшчэнная птушка! Ці ж сабачку нейкага катуюць, ці яшчэ нешта там. Трэба нам з гэтым пытаннем разабрацца. Я папрашу ўзяць гэта пад кантроль», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў Юрыя Тэртэля, якія яшчэ ёсць пытанні ў рабоце інспекцыі і ці неабходнае ўмяшанне Прэзідэнта.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

СУПРАЦОЎНІКІ ІНСПЕКЦЫІ ПРЫ НЕАБХОДНАСЦІ ЗМОГУЦЬ ПРЫМЯНЯЦЬ ЗБРОЮ

Юрый Тэртэль далажыў Прэзідэнту, што цяпер дзяржінспекцыя працуе ў рамках даручэнняў, дадзеных некалькі гадоў таму пры яго назначэнні на гэту пасаду. У першую чаргу значная ўвага аддадзена даручэнням адносна асабовага складу, па навядзенні парадку. «Сапраўды, мы прынялі ў гэтым напрамку сур'ёзныя меры. Таму што вамі абсалютна правільна было заўважана: была бязладзіца, разгільдзяйства, стаўленне да работы халатнае, калі не сказаць злачынна халатнае. У сувязі з гэтым прыйшлося прыняць дастаткова жорсткія меры. Былі звольнены 37 супрацоўнікаў. З іх — 26 службовых асоб з кіраўніцтва абласных і міжраённых інспекцый. Яшчэ прыкладна з васьмю дзясяткамі супрацоўнікаў прыйшлося развітацца па заканчэнні кантракта альбо з іншых прычын», — сказаў ён.

Пасля даклада ў Прэзідэнта **начальнік Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Беларусі Юрый ТЭРТЭЛЬ** сустрэўся з журналістамі. Па яго словах, супрацоўнікі інспекцыі пры неабходнасці змогуць прымяняць зброю, фізічную сілу і спецыяльныя сродкі.

«Мы падраздзяленне, якое ўзброена. На сёння кожны наш супрацоўнік узброены і пісталетам, і аўтаматам, што было зроблена па даручэнні Прэзідэнта. Мы ўнеслі асаблівыя змяненні ў праграму падрыхтоўкі нашых работнікаў. Адпаведна, ва ўказах, якія прымаў Прэзідэнт у 2019—2020 гадах, замацавалі заканадаўча прымяненне зброі, фізічнай сілы і спецыяльных сродкаў», — расказаў ён.

Падчас сустрэчы Аляксандр Лукашэнка папрасіў дзяржінспекцыю па ахове жывёльнага і раслiннага свету ўзяць на кантроль выпадкі здзекаў з жывёлін. Як расказаў Юрый Тэртэль, інспекцыя ўсе падобныя факты абагульняе, аналізуе і інфармуе адпаведныя органы. «У сувязі з даручэннем Прэзідэнта мы прымем меры па вывучэнні, больш глыбокім разуменні гэтай праблемы. І даложым, якія мы бачым шляхі вырашэння, у тым ліку змяненні ў заканадаўства», — сказаў ён.

Таксама Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што работа дзяржінспекцыі павінна быць удасканалена за кошт новых метадаў і формаў. Юрый Тэртэль расказаў журналістам, што кіраўнік дзяржавы адобрыў той шлях, па якім ідзе інспекцыя. У сувязі з невялікай колькасцю супрацоўнікаў, асноўнай формай работы абрана ўзаемадзеянне з прыродаахоўнымі органамі для павелічэння нарадаў ва ўгоддзях. З праваахоўнымі органамі інспекцыя па ахове жывёльнага і раслiннага свету ўзаемадзейнічае ў кантролі незаконнага захоўвання зброі і браканьерства.

Добрыя навіны

ПАВЯЛІЧВАЮЦЦА ПЕНСІІ І ДАПАМОГІ НА ДЗІЦЯ ДА ТРОХ ГАДОЎ

З 1 жніўня ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ад 25 ліпеня 2022 г. № 250 «Аб павышэнні пенсій» павышаюцца ўсе віды працоўных пенсій — па ўзросце, за выслугу гадоў, па інваліднасці, з нагоды страты карміцеля, паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Такім чынам, сярэдняя пенсія з даплатамі ў жніўні складзе 638 рублёў. Вырастуць і дапамогі на дзяцей ва ўзросце да трох гадоў.

Памер працоўнай пенсіі будзе павышаны на 10 працэнтаў. Атрымальнікамі працоўных пенсій з'яўляецца больш за 2,3 мільёна беларусаў.

— Памер павелічэння пенсіі ў кожнага пенсіянера будзе свой у залежнасці ад працягласці стажу і заробку, улічаных пры вылічэнні яму пенсіі, а таксама ўстаноўленых даплат да асноўнай пенсіі, — звяртае ўвагу **начальнік галоўнага ўпраўлення пенсіённага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алена ГОМАРАВА.**

Трэба ўлічваць, што да працоўнай пенсіі выплачваецца даплата непрацуючым грамадзянам ва ўзросце 75-79 гадоў і ва ўзросце 80 гадоў і старэйшым, надбаўка на догляд інвалідам 1-й групы, існуюць павышэнні ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, ганаровым донарам і некаторым іншым катэгорыям грамадзян.

— Гэтыя выплаты па нормах указа не пераразлічваюцца. Аднак яны таксама павялічваюцца са жніўня — у сувязі з ростам бюджэту пражыткавага мінімуму, — растлумачыла спецыяліст.

Сярэдні памер пенсіі па ўзросце непрацуючага пенсіянера ў жніўні 2022 года, уключаючы даплаты, складзе 638 рублёў. У жніўні расходы на выплату пенсій запланаваны ў памеры 1,4 мільярда рублёў, з іх амаль 122 мільёны рублёў — павышэнне згодна з Указам № 250.

Нагадаем, гэта другое павышэнне працоўных пенсій у бягучым годзе. Першае адбылося з сакавіка — на 7 %.

У цэлым расходы на выплату пенсій у 2022 годзе складуць больш як 16 мільярдаў рублёў, у тым ліку 1,4 мільярда рублёў у сувязі з павышэннем пенсій з 1 сакавіка і 1 жніўня.

З 1 жніўня 2022 года павялічваюцца і памеры дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

Такім чынам, з 1 жніўня гэтага года да 31 студзеня наступнага памеры дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў складуць:

на першае дзіця — 556,05 рубля;

на другога і наступных дзяцей — 635,48 рубля;

на дзіця-інваліда — 714,92 рубля.

Тэмп росту памераў дапамогі са жніўня 2022 года складзе 103,1 % (у параўнанні з ліпенем 2022 годам) і 112,2 % — у параўнанні са жніўнем 2021 года.

Нагадаем, што памеры дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў пералічваюцца два разы на год: з 1 лютага і 1 жніўня ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь № 7-З «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».

Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў складае:

на першае дзіця — 35 працэнтаў сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у краіне за квартал;

на другое і наступных дзяцей — 40 працэнтаў сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у краіне за квартал;

на дзіця-інваліда незалежна ад чарговасці яго нараджэння — 45 працэнтаў сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у краіне за квартал.

Дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў выплачваюцца больш чым на 238 тысяч дзяцей.

Усяго расходы на выплату дапамог па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у 2022 годзе складуць 1,7 мільярда рублёў, з іх каля 100 мільёнаў рублёў — у сувязі з іх павышэннем з 1 жніўня (на 3,1 %).

Алена КРАВЕЦ.

Герой нашага часу

ВЫКОНВАЎ СВАЮ ЗАДАЧУ

Капітан Аляксей АСТРОЎСКІ ўзнагароджаны медалём «За адвагу»

Камандзір сапёрна-піратэхнічнай групы вайсковай часці 5530 унутраных войскаў МУС капітан Аляксей Астроўскі прадстаўлены да ўзнагароджання медалём «За адвагу». Дзякуючы прафесійным дзеянням капітана ўдалося абяшкодзіць выбухованебяспечныя прадметы. У студзені бягучага года пры незаконнай перавозцы боепрыпасаў у аўтамабілі адбыўся выбух, у выніку якога загінуў чалавек. Аляксей аператыўна прыбыў на месца здарэння і выявіў у пашкоджаным транспартным сродку яшчэ сем артылерыйскіх снарадаў, якія ў выніку ліквідаваў.

Аказалася, снарады перавозіў «чорны капальнік». Астатнія боепрыпасы таксама маглі выбухнуць у любы момант. Супрацоўнікі следча-аператыўнай групы і спецыялісты, якія павінны былі забраць цела загінулага, былі эвакуіраваны. А капітан Астроўскі, прадумаўшы алгарытм дзеянняў, прыступіў да іх выканання.

— Вядома, не кожны дзень даводзіцца выконваць такія задачы, але я разумею, што машына ўяўляе пагрозу людзям, і не мог дапусціць, каб яны пацярпелі, — распавёў Аляксей.

Далейшая работа працягнулася на наступны дзень — афіцэр больш за пяць гадзін абследаваў мясцовасць, укладваў зарад на боепрыпасы, якія не разарваліся, і знішчаў без транспарціроўкі:

— Працэс быў нялёгкім: першапачаткова здэтанавалі чатыры снарады, тыя, што засталіся, адпрацоўваў на чарзе. Толькі праз некаторы час я зразумеў, наколькі складанай была сітуацыя, як я змог пераступіць цераз сябе і выцягнуць з машыны цела мёртвага чалавека. Галоўнае, што ўсё добра скончылася, і ніхто не пацярпеў, бо няма нічога важнейшага за жыццё і здароўе людзей, — адзначыў Аляксей Астроўскі.

На пытанне «Звязды», ці адчуваў падчас абяшкоджвання боепрыпасаў, што здзяйсняе подзвіг, капітан адказаў сціпла:

— Падчас працы ты ні аб чым іншым не думаеш. Проста выконваеш тую задачу, якую акрамя цябе ніхто не зробіць. Калі ў цябе ёсць падначалены асабісты састаў, рашэнне прыходзіць само сабой — ты павінен сам ацаніць абстаноўку і толькі пасля накіраваць людзей і даць ім заданні. Але як ні круці, гэта камандная работа.

Паведамленне аб узнагароджанні самым вядомым медалём Аляксей Астроўскі пракаментаваў наступным чынам:

— Галоўная эмоцыя, якую я зараз адчуваю — гэта радасць за тое, што работа засталася заўважанай.

Па словах капітана, работа ў сапёрна-піратэхнічнай групе звязана не толькі з трагічнымі здарэннямі, але і цікавымі знаходкамі — галоўная спецыфіка ў тым, што заўсёды адкрываецца нешта новае. Напрыклад падчас працы па боепрыпасам часоў Вялікай Айчыннай вайны, група даведваецца шмат гістарычных фактаў, звязаных з баявымі дзеяннямі таго перыяду:

— Кожная задача — гэта адрэналін, здаровы страх, які дапамагае самазахаванню, рацыянальная насцярожанасць і стрыманасць. Кожную работу выконваем акуратна, паслядоўна, прадумваючы кожнае дзеянне, — дадае капітан.

Арына КАРПОВІЧ.

Надвор'е

Ад гарачыні да холаду — адзін крок?

Да канца месяца тэмпература паветра будзе на 1-2 градусы ніжэйшая за кліматычную норму

Дажджы летам, як правіла, бываюць лёгкія і цёплыя. Але часам яны становяцца не па сезоне халоднымі і дакучлівымі. Менавіта такія дажджы прагназуюць сіноптыкі ў другой палове тыдня ў нашай краіне, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А ў першай палове тыдня ў Беларусі захаваецца ўмеранa цёплае надвор'е з тэмпературным фонам каля кліматычнай нормы і нават вышэйшым на 1-2 градусы. Пры гэтым у аўторак па заходніх рэгіёнах краіны тэмпература паветра ў разгар дня будзе дасягаць плюс 30—31 градуса. Па словах сіноптыкаў, у другой палове тыдня ў Беларусь пачне паступаць больш халоднае паветра. Тэмпературны фон панізіцца і будзе ў асноўным каля сярэдніх шматгадовых значэнняў і на 1-2 градуса ніжэйшы.

26 ліпеня надвор'е будзе пераважна без ападкаў, толькі днём месцамі па захадзе краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Вецер прагназуецца няўстойлівы слабы да ўмеранага, пры навальніцах парывісты. Удзень паветра прагрэецца да плюс 24—29 градусаў, па захадзе да плюс 31.

У сераду на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі магчымыя навальніцы. Вецер паўднёвы з пераходам на заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 13 да плюс 19 градусаў. Днём тэмпература дасягне плюс 20—26 градусаў, па паўднёвым усходзе 29 цяпла.

У чацвер чакаецца пераважна без ападкаў. Пры гэтым уначы па ўсходзе, а ўдзень па поўначы нашага рэгіёна месцамі магчымыя кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах будзе слабы туман. Вецер заходні, паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 9—16 градусаў, днём плюс 19—26 градусаў.

У пятніцу будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай месцамі па краіне магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да плюс 9—16 градусаў. Дарэчы, гэта дрэнна для росту агуркоў. Днём паветра прагрэецца да плюс 18—25 градусаў, па поўдні — да 27 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу чакаецца пераважна без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах краіны будзе туман. Уначы тэмпература паветра панізіцца да плюс 7—14 градусаў. Днём чакаецца 18—25 градусаў, па поўдні краіны 27 градусаў вышэй за нуль.

Сяргей КУРКАЧ.

Новы досвед

УЧОРА — АБІТУРЫЕНТ, А ЗАЎТРА — ПРАФАРЫЕНТОЛАГ

Студэнты БДУ стануць прафарыентолагамі-экскурсаводамі

Ва ўніверсітэце маецца шматгадовы вопыт прафарыентацыйнай дзейнасці, аднак цяпер гэты напрамак плануюць развіваць на якасна новым узроўні з пазіцыі мэтанакіраванай падрыхтоўкі студэнтаў і магістрантаў для работы з абітурыентамі.

Адукацыйная праграма Школы экскурсаводаў-прафарыентолагаў накіравана на развіццё кампетэнцый правядзення экскурсій па факультэтах, фарміраванне навыкаў кансультавання абітурыентаў па пытаннях паступлення ў БДУ і выбару найбольш прыдатнай спецыяльнасці.

Навучанне ўключае некалькі блокаў: заняткі па падрыхтоўцы іміджавых тэкстаў, квэст-кірунак, крэатыўную дзейнасць і работу з установамі адукацыі. Падрыхтоўка будзе праходзіць у фармаце інтэрактыўных семінараў, майстар-класаў і выязных мерапрыемстваў. Студэнты будуць вывучаць правілы і асаблівасці зносін з абітурыентамі, прыёмы аратарскага майстэрства, псіхалогію прыняцця рашэнняў. Таксама будучыя прафарыентолагі-экскурсаводы навучацца ствараць аўдыёвізуальны кантэнт аб жыцці, гісторыі і структуры факультэтаў, больш дэталёва даследаваць спецыфіку навучання ў БДУ і ўступную кампанію для аказання абітурыентам кваліфікаваных кансультацый.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Шайгу: вываз збожжа праз чарнаморскія парты Украіны можа пачацца ў бліжэйшыя дні

Вываз збожжа праз украінскія парты на Чорным моры пасля пагадненняў у Стамбуле можа пачацца ў найбліжэйшыя дні. Аб гэтым заявіў міністр абароны Расіі Сяргей Шайгу, інфармуе ТАСС.

«Сёння мы маем усе перадумовы і ўсе рашэнні, каб гэты працэс пачаўся ў самыя блізкія дні», — падкрэсліў расійскі міністр абароны.

Ён адзначыў важнасць падпісання мемарандума паміж Расіяй і ААН аб зняцці абмежаванняў з экспарту расійскай сельгаспрадукцыі і ўгнаенняў. «Звяртаю вашу ўвагу, што гэты дакумент быў падпісаны першым, пасля была прамая ўвязка да таго, каб з'явіўся наступны дакумент, які мы падпісалі толькі што на вашых вачах», — сказаў Сяргей Шайгу.

Як паведамлялася, 22 ліпеня ў Стамбуле быў падпісаны пакет дакументаў, прызначаных вырашыць праблему паставак прадуктаў харчавання і ўгнаенняў на сусветныя рынкі.

Арганізатары Алімпіяды-2024 у Парыжы сутыкнуліся з недахопам фінансавання з-за інфляцыі

Арганізатары летняй Алімпіяды, якая павінна адбыцца ў 2024 годзе ў Парыжы, зведваюць цяжкасці з фінансаваннем на фоне значнай інфляцыі ў Францыі. Аб гэтым паведамляе ТАСС са спасылкай на агенцтва AFP.

Адзначаецца, што год таму кампанія Solideo, якая адказвае за ўзвядзенне спартыўных аб'ектаў для Алімпіяды, ацэньвала расходы ў памеры чатырох мільярдаў еўра. Аднак сёлета аказалася, што з-за росту цэн гэтай сумы ўжо недастаткова.

Арганізатары таксама сутыкнуліся і з іншымі праблемамі. У прыватнасці, для забеспячэння бяспекі падчас Гульняў не хапае амаль 20 тысяч чалавек. Таксама паведамляецца, што будаўнікі не паспеюць своечасова пракласці дзве лініі метро, якія павінны былі злучыць цэнтр Парыжа і спартыўныя аб'екты.

У МАК таксама заявілі, што французскі бок вельмі позна пачаў вырашаць пытанні антыдопінгавай лагістыкі, што можа паўплываць на карэктную работу антыдопінгавых службаў.

Летняя Алімпіяда ў Парыжы пройдзе з 26 ліпеня да 11жніўня 2024 года.

САЗ аб'явіла ўспышку воспы малпаў надзвычайнай сітуацыяй сусветнага маштабу

Сусветная арганізацыя аховы здароўя (САЗ) аб'явіла ўспышку воспы малпаў надзвычайнай сітуацыяй у галіне аховы здароўя сусветнага маштабу. Гэта найвышэйшая ступень небяспекі, якую арганізацыя можа прысвоіць эпідэміі або пандэміі.

Як заявіў кіраўнік арганізацыі Тэдрас Аданом Гебрэесус, яе рашэнне звязанае з рэзкім ростам колькасці заражэнняў вірусам у свеце. Усяго выяўлена 16 тысяч выпадкаў заражэння ў 47 краінах, у той час як месяц таму такіх выпадкаў было ўсяго тры тысячы.

Гебрэесус растлумачыў, што рашэнне аб'явіць надзвычайную сітуацыю САЗ прымае па пяці крытэрыях, адзін з якіх — хуткасць распаўсюджвання віруса. У дадзеным выпадку вірус малпавай воспы хутка распаўсюдзіўся па краінах, дзе яго раней не было.

Кіраўнік САЗ растлумачыў, што рызыка заражэння воспай малпаў у розных рэгіёнах планеты цяпер розная. У Еўропе арганізацыя ацэньвае яе як высокую, у астатніх частках свету — як сярэднюю.

«Існуе відавочная рызыка далейшага распаўсюджвання віруса па розных краінах, хоць небяспеку таго, што вірус стане прычынай парушэння міжнародных зносін, мы ацэньваем як нізкую», — дадаў кіраўнік САЗ.

Ну і ну!

Жанчыну выратавалі на возеры, а праз пару гадзін яна вярнулася і патанула

Абсурдны, але ад гэтага не менш трагічны выпадак адбыўся ў аграгарадку Воранаўка Воранаўскага раёна, паведамляе «Вячэрні Гродна».

51-гадовая мясцовая жыхарка купалася ў вадаёме, будучы нецвярозай. У нейкі момант яна пачала тануць, аднак побач аказаліся «асводаўцы», якія і выратавалі жанчыну. Пасля таго яе перадалі супрацоўнікам міліцыі, якія склалі на яе пратакол і адпусцілі.

Аднак хутка жанчына вырашыла вярнуцца на злашчасны вадаём і зноў увайшла ў ваду, дзе і патанула.

Тым часам на гарадскім вадаёме Паўднёвы ў Ганцавічах патануў мужчына, якога летась выратаваў работнік Таварыства выратавання на водах, паведамілі ў Брэсцкім абласным аддзяленні гэтай арганізацыі.

Выпадак здарыўся 22 ліпеня каля 18.00 у паўночна-ўсходняй частцы вадаёма — у месцы, не прызначаным для купання. Жыхар вёскі Боркі, 1968 года нараджэння, адпачываў на беразе з прыяцелем, ужываючы спіртныя напоі. Са слоў відавочцаў, мужчына пайшоў купацца ў адзенні і, праплыўшы некалькі метраў, знік пад вадой. Цела дасталі ўжо без бачных прыкмет жыцця. Медыкі, якія прыбылі на месца здарэння, канстатавалі смерць чалавека.

«Летась, у чэрвені, гэты ж грамадзянін ужо тануў пры купанні ў гэтым вадаёме. Ён таксама быў у нецвярозым стане. Тады яго паспеў выцягнуць работнік выратавальнага паста АСВОД», — дапоўнілі ў абласной арганізацыі.

У гэты ж дзень, 22 ліпеня, у вёсцы Міронім Івацэвіцкага раёна адпачывальнікі на мясцовым возеры знайшлі і дасталі на бераг патанулую жыхарку Івацэвічаў 1963 года нараджэння. Вядома, што напярэдадні ўвечары жанчына ўжывала спіртное ў кампаніі на беразе вадаёма.

«ВЯЛІКАГА ВАЛОДЗЮ З БЕЛАРУСІ»

Уладзімір Мікалаевіч Рыжанкоў пайшоў з жыцця ў 1996 годзе. Але нават праз 26 гадоў яго прозвішча гучыць у беларускім спорце. Максім Уладзіміравіч Рыжанкоў, яго сын, быў памочнікам Прэзідэнта па пытаннях фізкультуры, спорту і турызму. Затым віцэ-прэзідэнтам НАК Беларусі. А сёння займае пасаду першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта і ўзначальвае федэрацыю баскетбола. Пра свайго знакамітага бацьку і яго ўклад у айчынны спорт Максім Рыжанкоў расказаў «Звяздзе».

З алімпійскім чэмпіёнам Аляксандрам Мядзведзем.

— Максім Уладзіміравіч, адкуль у вашага бацькі любоў да спорту? Чаму менавіта яго ён абраў справай свайго жыцця?

— Усё, чаго мой бацька, Уладзімір Мікалаевіч Рыжанкоў, дабіўся ў жыцці, ён дабіўся сваёй працай. Хлопец з хутарскога пасёлка ў Добрушскім раёне ў дзяцінстве нават не думаў ні пра які спорт. Я думаю, у ягоны час там нават і спартыўных пляцовак не было. Дома мелася вялікая гаспадарка, трэба было дапамагаць бацькам, вось і ўвесь яго спорт. У 14 гадоў у бацькі пачалося дарослае жыццё — ён паступіў у Гомельскі дарожна-будаўнічы тэхнікум. Там была актыўная вучоба, і пра спорт таксама размова не ішла. Усё змянілася, калі бацьку прызвалі ў армію. Ён 1945 года нараджэння, гэта апошні год, які прызывалі на тры гады. За час службы ён паспрабаваў сябе ў боксе і баскетболе, выступаў на спаборніцтвах. Яго вялікі рост, мускулісты целасклад, падрыхтоўка, закладзеная працай на зямлі, рабілі яго добрым баксёрам. А яго баскетбольная каманда была пераможцам спаборніцтваў на ўзроўні вайсковай акругі. Уладзімір Мікалаевіч спачатку служыў у «вучэбцы» ў Горкім (Ніжні Ноўгарад). А затым — у будаўнічых войсках, яны ўзводзілі касмадром «Байканур».

«Гэта быў чалавек, які прыцягваў да сябе людзей не інтрыгамі, а сваімі ідэямі. І калі паўстала пытанне, каму стаць прэзідэнтам Алімпійскага камітэта, які бацька стварыў з нуля, то нядзіўна, што спартыўная грамадскасць прагаласавала за яго».

З войска ён вярнуўся з навыкамі будаўніка і перамогамі ў спаборніцтвах па боксе і баскетболе ў Спартыўным клубе Арміі. Ды яшчэ і ў званні старшыны. Як я разумею, гэта дало яму магчымасць паступіць у Інстытут фізічнай культуры з пэўнымі прэферэнцыямі. І гэтую магчымасць не выпусціў. Ён лёгка паступіў у ІФК. Бацька вучыўся са многімі ў будучым вядомымі баскетбалістамі. Напрыклад, з Аляксеем Шукшыным яны потым сябравалі ўсё жыццё. Але бацька расказваў, што яму было цяжкавата вучыцца. Ён паступіў у інстытут пасля арміі, некаторыя прадметы прызабыў. І, вядома, хлопцам, якія прыйшлі ў ВНУ адразу са школьнай лавы, было прасцей. Уплывала і розніца ва ўзросце, бацька быў старэйшы за многіх сваіх аднакурснікаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але ён змог уліцца ў гэтую спартыўную сям'ю. Дзякуючы яго вайсковым поспехам ім зацікавіліся і баксёры, і баскетбалісты. Але, напэўна, яму больш даспадобы быў баскетбол, таму ён яго абраў.

— Тады чаму ён пачаў будаваць кар'еру кіраўніка, а не спартсмена?

— У грамадскую работу бацька ўключыўся ўжо ў інстытуце. У той час на пасады прафсаюзных ці камсамольскіх кіраўнікоў бралі людзей, якія ўжо ў жыцці нешта бачылі, прайшлі армію, працавалі. Словам, ведалі жыццё больш, чым учарашнія выпускнікі школ. Уладзімір Мікалаевіч гэтым крытэрыям цалкам адпавядаў. У інстытут ён прыйшоў са сфарміраванымі поглядамі, моцным падыходам да жыцця. Менавіта такі чалавек патрэбен быў для арганізацыйнай работы. Яго заўважылі і запрасілі на адну з кіруючых пасад у камітэт камсамола Інстытута фізічнай культуры. На адным з курсаў ён нават быў кіраўніком будаўнічых атрадаў Мінскай вобласці. Вучобу ў інстытуце Уладзімір Мікалаевіч скончыў старшынёй камсамола ІФК. Чаму ён засяродзіўся менавіта на арганізацыйнай рабоце, а не на спартыўнай кар'еры? Так, ён дастаткова прыстойна гуляў у баскетбол за інстытут. Але, выступаючы за інстытут, ён быў запатрабаваны, а за зборную ўжо не так. Бо ён быў на тры гады старэйшы за сваіх таварышаў, хлопцаў, у якіх не было такога перапынку, якія былі лепш падрыхтаваныя тэхнічна — хтосьці вучыўся ў спартыўнай школе, хтосьці займаўся ў вучылішчы алімпійскага рэзерву. І канкурэнцыю ім Уладзімір Мікалаевіч скласці не мог. Таму ён знайшоў сябе ў арганізацыйнай рабоце. Хлопец прыехаў з Гомельшчыны, тры гады адслужыў у войску, бацькі маглі дапамагчы хіба што мяшком бульбы. Яму трэба было стварацца сябе самому. Калі ў спорце з аб'ектыўных прычын не атрымлівалася, то ў арганізацыйнай рабоце перад ім адкрываліся вялікія перспектывы. Свой шанц Уладзімір Мікалаевіч не ўпусціў.

— Вы памятаеце, як стваралася Нацыянальны Алімпійскі камітэт краіны. Якой гэтую арганізацыю бачыў Уладзімір Мікалаевіч?

— Працуючы ў Спорткамітэце, бацька шмат ездзіў за мяжу і бачыў, вывучаў сістэму развіцця спорту ў іншых краінах. Розніца ў падыходах была каласальнай. Моцныя спартыўныя федэрацыі, якія праводзяць работу па папулярызацыі свайго віду спорту, прыцягваюць людзей, партнёраў і спонсараў у свой спорт — гэта магутная рухаючая сіла. У савецкім спорце такога не было. Многія чыноўнікі ў міністэрствах і ведамствах на гэта проста былі няздольныя. А ў федэрацыях павінны працаваць людзі, улюбёныя ў свой від спорту. І ўсё гэта павінна рэгулявацца дзяржавай. Уладзімір Мікалаевіч бачыў і разумеў, што ў сістэме нашага спорту трэба памяняць і што можна прыўнесці.

«Уладзімір Мікалаевіч апярэдзіў свой час. Напрыклад, у сваім імкненні развіць грамадскія інстытуты кіравання спортам. Бацька хацеў стварыць новую мадэль беларускага спорту».

Калі пачаліся першыя крокі па набыцці незалежнасці, бацька зразумеў, што пупавіна ад Алімпійскага камітэта і федэрацый СССР разарвецца, і многія напрацоўкі застануцца ў Расіі як праваперамніка Савецкага Саюза. Таму, як толькі Беларусь набыла незалежнасць, ён пачаў рабіць першыя крокі па стварэнні Алімпійскага камітэта Беларусі. І, зразумела, на гэтым шляху даводзілася перайманць досвед замежных мадэляў: федэрацыі павінны быць больш самастойнымі і ў фінансавым, і ў арганізацыйным планах, нацыянальны Алімпійскі камітэт павінен быць незалежны ад дзяржаўных крыніц. Менавіта ў такім напрамку бацька стварай гэтыя грамадскія інстытуты кіравання спортам. Улічваючы, што ён адначасова быў і міністрам спорту, канфлікту інтарэсаў не было. Як міністр спорту ён глядзеў на НАК і федэрацыі як на сваіх памочнікаў, паплечнікаў у развіцці спорту, але ні ў якім разе не як на канкурэнтаў.

У 1991 годзе, калі быў створаны Нацыянальны Алімпійскі камітэт, ва Уладзіміра Мікалаевіча Рыжанкова склаўся магутны аўтарытэт як кіраўніка спорту. Гэта быў чалавек, які прыцягваў да сябе людзей не інтрыгамі, а сваімі ідэямі. І калі паўстала пытанне, каму стаць прэзідэнтам Алімпійскага камітэта, які бацька стварай з нуля, то нядзіўна, што спартыўная грамадскасць прагаласавала за яго. Не магу сказаць, аднагалосна ці не, але не думаю, што былі іншыя кандыдатуры. Уладзімір Мікалаевіч адразу ўвёў у Нацыянальны Алімпійскі камітэт такіх сур'ёзных людзей, як Аляксандр Васільевіч Мядзведзь, Алена Дзмітрыеўна Бялова. Ён зрабіў усё, каб паказаць, што самастойны алімпійскі камітэт — не кармушка для чыноўнікаў, а менавіта орган спартсменаў для саміх спартсменаў.

— У 1991 годзе быў утворaны Нацыянальны Алімпійскі камітэт. А ў 1992 годзе ў Барселоне павінны былі прайсці летнія Алімпійскія гульні, а ў Альбервілі — зімовыя. Сур'ёзнае выпрабаванне для маладога Алімпійскага камітэта...

— У 1992 годзе Беларусь яшчэ не была прынята ў сістэму алімпійскага руху. Таму ў 1992 годзе беларускія спартсмены выступалі ў складзе Аб'яднанай каманды СНД. Я ведаю, што перад Алімпіядай у Альбервілі вялікім галаўным болем для бацькі была экіпіроўка каманды, грошы на дарогу. Гэта быў не самы эканамічна паспяховы час. Грошай не было, і бацьку прыйшлося праявіць кемлівасць. Ён высветліў, што ёсць трактары і МАЗы, якія наш урад хацеў прадаць, але ў пакупнікоў таксама не было грошай. Па сваіх спартыўных каналах бацька выйшаў на югаславаў, з якімі ў яго заўсёды былі добрыя адносіны. І праблема была вырашана: туды паступілі беларускія трактары і МАЗы, а адтуль прыйшлі грошы на дарогу і экіпіроўка. Далей трэба было рабіць усё, каб на наступных Алімпіядах беларусы выступалі самастойнай камандай. Без прызнання нашага Алімпійскага камітэта Міжнародным Алімпійскім камітэтам гэта было немагчыма. Таму трэба было фарсіраваць дзеянні па стварэнні асноў алімпійскага руху ў Беларусі. Цікава, што займалася гэтай работай усяго некалькі чалавек: міжнародны аддзел у сістэме камітэта па спорце і некалькі спартсменаў, якія былі ўключаны ў склад сакратарыята. Людзі на грамадскіх пачатках выконвалі такую вялікую і важную работу.

— У той жа час ствараўся Закон «Аб фізкультуры і спорце». Памятаеце, як Уладзімір Мікалаевіч працаваў над ім?

— Гэта я памятаю цудоўна, паколькі сам удзельнічаў у падрыхтоўцы закона. Раней у нас не было заканадаўства ў сферы культуры і спорту. Таму пры стварэнні закона трэба было на нешта абапірацца. Але ні ў Расіі, ні ў іншых краінах постсавецкай прасторы такога закона яшчэ не было. У кожнай замежнай камандзіроўцы бацька сустракаўся са сваімі калегамі, з міністрамі спорту, з прэзідэнтамі Алімпійскіх камітэтаў. У камандзіроўках ён назбіраў вялікі масіў інфармацыі. У асноўным усе дакументы былі на англійскай мове. І, відаць, бацька вырашыў правяpыць, як я вучу англійскую на сваім юрыдычным факультэце. А можа, хацеў уцягнуць мяне ў гэтыя працэсы, каб у мяне з'явілася практыка. Ён паклаў мне стос папер на стол і сказаў: «Калі хочаш дапамагчы бацьку — перакладзі, паглядзі, што істотна, а што — не».

Як юрыст магу сказаць, што ў кожным нарматыўна-прававым акце ёсць шэраг палажэнняў, якія датычацца пэўных працэдурных пытанняў, яны не маюць вялікай важнасці, іх адпрацуюць юрысты любой краіны. Але сутнасць, дух закона можа апісаць толькі спартыўны чалавек, які любіць спорт і ім займаецца. У нас такія людзі былі, але яны не ведалі, як свой вопыт апісаць у законе юрыдычнай мовай. І я, студэнт, які крыху разумее юрыдычную думку, перакладаў, што думаюць пра спорт замежныя чыноўнікі. Пазней гэтыя перакладзеныя блокі вывучалі спецыялісты ў Міністэрстве спорту і Алімпійскім камітэце, адаптавалі іх да беларускага закона. Вядома, юрыстаў у спартыўнай галіне не было ўвогуле. Шмат гадоў да гэтага Беларусь усю работу па кіраванні спортам пераймала ў СССР, часткай якога была. І сваіх уласных напрацовак практычна не існавала. У 1990-я прыйшлося ўсё пачынаць з нуля, рабіць першыя крокі. Бацька шмат працаваў над гэтым законам самастойна. У дамашнім архіве захаваліся цэлыя пачкі паперы, спісаныя яго рукой. Гэты закон пісаўся ўручную, у прамым сэнсе гэтага слова. І ўсё атрымалася, закон быў прыняты. Сваю частку работы я выканаў, здаецца, нядрэнна. Памятаю, як бацька вярнуўся з камандзіроўкі, у яго засталіся сутачныя ў іспанскіх песетах, і ён аддаў іх мне як плату за працу. Я іх абмяняў і быў вельмі задаволены.

— У сваіх шматлікіх камандзіроўках Уладзімір Мікалаевіч змог знайсці не толькі надзейных калег, але і добрых сяброў?

— У бацькі былі вельмі сур'ёзныя адносіны з Міжнародным Алімпійскім камітэтам. Хуан Антоніа Самаранч (прэзідэнт МАК — **Заўв. аўт.**) быў блізкім яму чалавекам, хоць яны і пазнаёміліся ўжо ў дарослым узросце. Самаранч адразу ацаніў бацьку, яго харызму і энтузіязм наконт стварэння алімпійскага руху ў Беларусі. Беларусь адной з першых постсавецкіх краін атрымала прызнанне МАК. Беларусь была адной з першых краін, у якую Самаранч прыехаў з візітам. У 1990-я беларуская дэлегацыя нават запрашалася на выканкамы Міжнароднага Алімпійскага камітэта. Цікавасць да нашай краіны была вялізная: новая незалежная дзяржава развівае алімпійскі рух. Бацька расказваў, што ў МАК адчувалася шчырае жаданне нам дапамагчы з выбудоўваннем сістэмы алімпійскага руху. Дапамагалі і парадамі, і фінансамі на развіццё нейкіх інстытутаў, адразу ж адгукнуліся на вырашэнне пытанняў, звязаных з удзелам у спаборніцтвах. Прыязджаючы з такіх мерапрыемстваў, бацька прывозіў

У коле сям'і.

ВЕДАЛІ ЎСЕ

шмат падарункаў і нават асабіста ад Самаранча. Прывозіў шмат дыпломаў аб прызнанні розных дасягненняў нашага Нацыянальнага Алімпійскага камітэта. Міжнародны Алімпійскі камітэт заўважаў нашы, няхай і маленькія, поспехі, для таго каб падтрымаць развіццё алімпійскага руху ў нашай краіне.

У бацькі былі сябры ў розных дэпартаментах МАК. Аднойчы прадстаўнік Югаславіі, кіраўнік маркетынгавай службы МАК, будучы з рабочым візітам у Беларусі, быў у гасцях у нас дома. Я ў той вечар выступаў у ролі перакладчыка. Ну ці яны з бацькам правяралі маё веданне англійскай мовы. Памятаю, што той чыноўнік мяне пахваліў і сказаў, што, магчыма, калі-небудзь забярэ мяне ў МАК. Жак Рогэ заўсёды цёпла выказваўся аб бацьку.

«Хлопец прыехаў з Гомельшчыны, тры гады адслужыў у войску, бацькі маглі дапамагчы хіба што мяшком бульбы. Яму трэба было ствараць сябе самому. Калі ў спорце з аб'ектыўных прычын не атрымлівалася, то ў арганізацыйнай рабоце перад ім адкрываліся вялікія перспектывы. Свой шанц Уладзімір Мікалаевіч не ўпусціў».

У бацькі было шмат сяброў з іншых дзяржаў. Калі я быў віцэ-прэзідэнтам НАК і шмат дзе ездзіў, сустракаў мноства знаёмых майго бацькі. Даведаўшыся, што я сын «таго самага Рыжанкова з Беларусі», яны вельмі радаваліся нашай сустрэчы і казалі многа цёплых слоў пра бацьку. Ён сябраваў з усімі, прытым што замежныя мовы амаль не ведаў. Але «вялікага Валодзю з Беларусі» ведалі ўсе і памяталі многія.

— Пра такіх людзей, як ваш бацька, кажуць, што той апярэдзіў час. Вы згодныя, што ў нечым ён апярэдзіў час, і калі так, то ў чым?

— Уладзімір Мікалаевіч апярэдзіў свой час. Напрыклад, у сваім імкненні развіць грамадскія інстытуты кіравання спортам. Бацька хацеў стварыць новую мадэль беларускага спорту. У той час я быў далёкі ад спартыўных рэчаў і не магу дакладна сказаць, як ён яе бачыў. Але тое, што бацька хацеў большай самастойнасці для федэрацый — гэта дакладна. Ён лічыў, што фінансаванне спорту праз федэрацыі больш эфектыўнае і больш выгаднае для ўсёй сістэмы, чым праз міністэрства. І нават некалькі гадоў у нас дзейнічала пробная сістэма, калі грошы на развіццё спорту непасрэдна пералічваліся федэрацыям. Таму што ніхто так не бачыць спорт, ярка і дэталёва, як самі федэрацыі. Насамрэч, сёння можна шмат зрабіць таго, да чаго бацька імкнуўся тады. І рэалізаваў бы свае планы, калі б лёс даў яму такую магчымасць і крыху больш часу. Гэта і вялікая самастойнасць федэрацый, і больш актыўная арганізацыйна-кіруючая роля Алімпійскага камітэта ў сістэме каардынат спорту, і выбудоўванне паўнавартасных маркетынгавых службаў у спартыўнай «вертыкалі» з апорай на федэрацыі і Алімпійскі камітэт. Ён працаваў над тым, каб нашы

З прэзідэнтам МАК Хуанам Антоніа Самаранчам.

прадстаўнікі былі больш уцягнутыя ў міжнародныя структуры. Вось да такога ўзроўню, які бацька ўзяў для сябе арыенцірам, мы, на мой погляд, і сёння не дайшлі ў поўнай меры.

— Кіруючая пасада моцна ўплывае на характар чалавека. Дома Уладзімір Мікалаевіч быў кіраўніком?

— Бацька ніколі не прыносіў рабочыя пытанні дадому. Работа ў спорце, як і ў любой іншай сферы, дзе ўсярэдзіне знаходзяцца людзі, якія лічаць сябе цэнтрам сусвету, звязаная з інтрыгамі, канкурэнцыяй, барацьбой за месца пад сонцам. І, будучы пад прыгнётам такіх праблем, сваю сям'ю бацька ад гэтага засцерагаў. Са спорту мы бачылі яго сяброў, уражанні ад удалых паездак, добрыя перажыванні і радасць ад перамог нашых спартсменаў. Калі бацьку казалі, што сын, мусіць, пойдзе па яго слядах, ён катэгарычна адказваў, што такога не будзе ніколі. Ён ведаў, якая гэта цяжкая і часам няўдзячная работа. Але ён настойваў на тым, каб я займаўся спортам. З шасці гадоў і да сёмага класа я займаўся баскетболам. І даволі нядрэнна. А потым перайшоў у веславанне на байдарках і каноэ.

— Нечаканы пераход...

— У сёмым класе паўстала пытанне аб пераходзе ў спартыўны клас, які якраз фарміраваўся з хлопцаў майго ўзросту. Дарэчы, у гэтым класе вырас касцяк юнацкай зборнай, якая была прызёрам чэмпіянату СССР. Бацька быў не супраць пераходу ў спартыўны клас. Але грудзьмі на амбразуру лягла мама, якая не хацела для мяне такога спартыўнага жыцця, як у бацькі. Як я потым даведаўся, яны ўсё жыццё рыхтавалі мяне да таго, каб я стаў дыпламатам. Таму перспектыва вучобы ў спартыўным класе для мяне адпала. Некаторы час я яшчэ трэніраваўся са сваёй камандай, але розніца ў падрыхтоўцы хутка дала аб сабе знаць. І праз пару месяцаў я зразумеў, што мушу пакінуць каманду.

Некалькі гадоў бестурботнага з пункту гледжання спорту жыцця вымусілі майго бацьку знайсці мне іншы від спорту, каб у маім жыцці была больш сур'ёзная фізічная нагрузка, чым проста ўрокі фізкультуры ў школе. Я быў не супраць. Недалёка ад дома, на Камсамольскім возеры, была лодачная станцыя з секцыяй веславання на байдарках і каноэ. Трэнер Уладзімір Іванавіч Тайнікоў, сябар бацькі, чэмпіён свету, перадаваў свой вопыт дзецям. Для фізічна развітога хлопца цалкам нармальна пачынаць займацца веславаннем у 14 гадоў. Я прыжыўся ў той секцыі і паўтара года займаўся веславаннем на байдарках і каноэ. І вельмі гэтаму рады, бо веславанне мяне сур'ёзна падцягнула, гэты спорт патрабуе сур'ёзнай фізічнай падрыхтоўкі. Да гэтага часу адчуваю добрыя наступствы ўтомных заняткаў спортам і закладзенага пачуцця дысцыпліны і працавітасці.

— Максім Уладзіміравіч, вы здзейснілі жаданне бацькоў і сталі дыпламатам, але ў той жа час парушылі жаданне бацькі і працуеце ў спорце. Аднак хіба сёння спорт і дыпламатыя — не адно і тое ж?

— Сапраўды, сучасны спорт ужо ператварыўся ў дыпламатыю і абсалютную палітыку. Ад спорту ўжо мала што засталося. Ужо няма справядлівых спаборніцтваў. Аб якіх справядлівых спаборніцтвах можа ісці гаворка, калі людзей адхіляюць на надуманых падставах? На надуманых падставах ладзяць допінгавыя скандалы. Насамрэч гэта ўжо брудная палітыка і не менш брудная дыпламатыя. Вось што сёння спорт, на жаль.

— Працуючы ў спартыўнай сферы, вы адчувалі, што вас параўноўваюць з бацькам?

— У самым пачатку маёй спартыўнай работы такое было. І я на сабе нёс груз вялікай адказнасці. Я не лічыў, што я павінен камусьці нешта даказаць. Самае галоўнае — я баяўся падвесці свайго бацьку. Каб потым не казалі, што Рыжанкоў-старэйшы шмат зрабіў, а прыйшоў Рыжанкоў-малодшы і ўсё развaліў. Вось што для мяне мела важнасць і дадавала адказнасці, прымушала больш акуратна і ўзважана адпрацоўваць усе пытанні. У пачатку сваёй дзейнасці я ўспомніў не толькі тыя рэчы, якія ведаў і бачыў ад бацькі, але і яго сяброў, знаёмых, паплечнікаў, з кім ён будаваў архітэктуру незалежнага беларускага спорту. Вядома, я прыцягнуў іх да сябе ў памочнікі. І мае першыя крокі, ідэі, прапанаваныя Прэзідэнту, праграмныя выказванні — гэта калектыўная праца людзей, якія былі побач са мной, а да гэтага — побач з маім бацькам.

— Вы падобныя да свайго бацькі?

— Я не ведаю. У мяне больш эмацыянальнасці. А ў яго адназначна было больш разумення жыцця. Калі б я больш бачыў яго ў рабоце ці паспеў бы папрацаваць побач з ім, думаю, я абапіраўся б на яго прыклад. Але не атрымалася. Самае галоўнае, што я ад яго пераняў, — вельмі ўважлівае стаўленне да людзей, імкненне дапамагаць, не думаючы аб наступствах, аб падзяках. Трэба проста, як кажа наш Прэзідэнт, якасна рабіць сваю работу. І, як і мой бацька, я стараюся бачыць, чуць і слухаць людзей і заўсёды рабіць па справядлівасці.

Валерыя СЦЯЦКО.

Даты

ЗБОРНАЯ СНД НІ ПРА ШТО, АКРАМЯ ВЫСТУПЛЕННЯ, НЕ ДУМАЛА

Героі Алімпіяды-1992 зноў сабраліся разам

54 спартсмены, 22 узнагароды (13 з якіх залатыя) — 30 гадоў таму беларускія спартсмены выступілі на XXV Алімпійскіх гульнях у Барселоне. Тады сапраўднай зоркай Гульняў стаў беларускі гімнаст Віталь Шчэрба, які шэсць разоў падымаўся на верхнюю прыступку алімпійскага п'едэстала. Трыумфатарамі Алімпіяды сталі весляры на байдарках і каноэ Дзмітрый Даўгалёнак і Аляксандр Масяйкоў, цяжкаатлеты Леанід Тараненка і Аляксандр Курловіч, стралок Канстанцін Лукашык, плаўчыха Алена Рудкоўская, гімнастка Святлана Багінская. У складзе зборнай па баскетболе алімпійскімі чэмпіёнкамі сталі Ірына Сумнікава і Алена Швайбовіч, а алімпійскімі чэмпіёнамі па гандболе сталі Андрэй Барбашынскі, Андрэй Мінеўскі і Міхаіл Якімовіч.

Праз 30 гадоў пасля адкрыцця Алімпіяды ў Барселоне, пераможцы і прызёры тых Гульняў сустрэліся ў Нацыянальным Алімпійскім камітэце. Падзяліліся ўспамінамі, сённяшнімі справамі, прапанавалі сваё бачанне развіцця спорту. З памятнай датай праслаўленых атлетаў павіншаваў **Прэзідэнт Нацыянальнага Алімпійскага камітэта Віктар ЛУКАШЭНКА.** «Многія з вас ужо былі прызнанымі чэмпіёнамі перад летнімі Гульнямі ў Барселоне, але менавіта ў 1992 годзе ўсёй камандзе СНД, улічваючы палітычныя змены ў свеце, прыйшлося няпроста. Аднак у гэтай сітуацыі вы знайшлі ў сабе самае галоўнае — матывацыю. Усяго беларускія атлеты ў Барселоне заваявалі 22 медалі: 13 залатых, 4 сярэбраныя і 5 бронзавых узнагарод. Прыемна з вамі знаходзіцца побач. Вы ўсе некалі выступалі ў адной алімпійскай камандзе, цяпер многія з вас перадаюць вопыт і веды моладзі. Упэўнены, сёння вам ёсць што ўспомніць і абмеркаваць», — сказаў ён.

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение от 1 % до 10 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущего аукциона по лотам опубликовано в в ЕГРСоБ и газете «Звязда» 31.05.2022

Аукцион состоится 10.08.2022 в **13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.

Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 26.07.2022 по 09.08.2022 до 17.00 по указанному адресу

Контактные телефоны: +375 17 280-36-37; +375 44-704-92-06. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. www.cpo.by**
Продавец	**ОАО «СМТ № 41» г. Сморгонь, Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Гагарина, 24**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Навес арматурный (Здание нежилое),
инвентарный номер 443/С-14639, общ. пл. 1123,2,
адрес: Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, д. 34.

Составные части и принадлежности: одноэтажное железобетонное здание навеса (А1/п). ***Земельный участок,*** общ. пл. 0,1401 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания навеса арматурного

Начальная цена – 186 565,09 бел. руб. (с НДС 20 %).
Шаг аукциона: **5 %** от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X. УНП 191 021 390. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания торгов: 26.08.2022 с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема документов: заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по **24.08.2022 до 17.00**

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**Унитарное предприятие «ИЦТ ГОРИЗОНТ», г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов: оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Красная, 7

№ лота	Наименование	Инвентарный №	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	Станок универсально-фрезерный УФ 250-02	95426	6 701,40
2	Гравировально-фрезерный станок 6Л463	95433	1 101,60
3	Координатно-расточный станок 2421	95437	2 478,60
4	Станок точильно-шлифовальный двусторонний 3Л631	95032	862,92
5	Круглопильный станок ДЦ-334	95460	918,00
6	Универсально-фрезерный станок	98186	4 977,60
7	Полировальный шлифовальный станок 3В852	95566	7 986,60
8	Ножницы гильотинные	95767	9 792,00
9	Ножницы гильотинные с виброопорами НЛ3416	97247	10 260,00

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by**. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **10 (десять) процентов** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Извещение о предыдущих электронных торгах опубликовано в газете «Звязда» 18.06.2022.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 05.08.2022 г. с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема документов: заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по **04.08.2022 до 17.00**

Контактные данные	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТРЕТЬИХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2022.Б.002.00077

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении третьих повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Новополоцкому обществу с ограниченной ответственностью «Мастак», УНП 300515730, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 152Б21225 в экономическом суде Витебской области.

Номер лота, вид выставляемого на третьи повторные электронные торги имущества:

Лот № 1: Недвижимое имущество.

Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения:

Изолированное помещение с инв. № 250/D-36474 площадью 1127,4 кв. м, наименование – помещение многофункциональное, назначение – помещение многофункциональное, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, 68-4. Изолированное помещение с инв. № 250/D-36634 площадью 197,4 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, 68-1, составные части и принадлежности: уборная, мощение (асфальтобетонное и бетонное), ограждение (проволочное), ворота, ограждение (бетонные плиты), калитка, бордюр. Капитальное строение с инв. № 250/С-32928 площадью 852 кв. м, наименование – навес, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, д. 68.

Капитальное строение с инв. № 250/С-32919, наименование – линии наружного освещения, назначение – сооружение специализированное энергетики, протяженность сооружения – 1959,5 м, из них кабели – 1697,0 м и провода – 262,5 м, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, д. 68.

Капитальное строение с инв. № 250/С-32923, наименование – тепловая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики, протяженность сооружения – 65,5 м по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, д. 68. Капитальное строение с инв. № 250/С-32920 наименование – водопроводная сеть (противопожарная), назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, протяженность сооружения – 719,6 м, составные части и принадлежности: резервуары запаса воды № 1, № 2, № 3, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, д. 68. Вышеуказанное имущество находится на земельном участке с кадастровым № 243500000005000037 площадью 1,3868 га по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, 68, назначение – для использования под производственную базу (право постоянного пользования, доля – 17/25). Капитальное строение с инв. № 250/С-32924, наименование – водопроводная сеть внеплощадочная, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, протяженность сооружения – 307 м по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Тросницкая, пер. Тросницкий 1-й, пер. Осипенко, ул. Лазо. Капитальное строение с инв. № 250/С-32926, наименование – подъездная автодорога, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, площадь – 1155,0 кв. м, протяженность сооружения – 126,5 м, материал покрытия – бетон, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, д. 68, составные части и принадлежности: проезжая часть, пешеходная часть. Кап. строение с инв. № 250/С-32926 находится на следующих земельных участках: зем. участок с кадастровым № 243500000005001761 площадью 0,0206 га по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, 68, назначение – для содержания и обслуживания проезда через железнодорожный переезд к производственной базе (право постоянного пользования), и зем. участок с кадастровым № 243500000005001760 площадью 0,1643 га по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, 68, назначение – для содержания и обслуживания проезда через железнодорожный переезд к производственной базе (право постоянного пользования).

Начальная цена: 133 404,81 бел. руб. без НДС.

Минимальная цена: 80 042,89 бел. руб. без НДС.

Условия третьих повторных электронных торгов: Победитель электронных торгов (единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение электронных торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам электронных торгов документации, необходимой для их проведения, расходы по проведению независимой оценки и услуги оператора ЭТП согласно Прейскуранту ЭТП, подписать договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения электронных торгов.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Имеющиеся обременения в отношении имущества: нет.

Дата и время начала и завершения третьих повторных электронных торгов: 22.08.2022 с 9.00 до 16.00.

Третьи повторные электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by/.

Для участия в третьих повторных электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию к участию участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до **16.00 19.08.2022.**

Задаток по лоту № 1 в сумме **13 340,48** (тринадцать тысяч триста сорок рублей 48 копеек) белорусских рублей должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК МТВКВУ22.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.

Справочная информация:

Контактные телефоны антикризисного управляющего: +375 (29) 680-72-22, +375 (29) 166-85-33.

Контактный телефон для осмотра объектов +375 (29) 135-39-70.

Контактные телефоны лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов): в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения предмета электронных торгов по предварительному согласованию с Продавцом.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно смете затрат и прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на **http://etpvit.by/** до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

Па палічках

«МОНСТРЫ» Ў ВАШЫМ ДОМЕ

Як у пагоні за прыгажосцю інтэр'ера не нанесці сабе шкоду?

Дом без пакаёвых раслін выглядае неабжытым і няўтульным. Кветкі аздабляюць інтэр'ер. Да таго ж яны забяспечваюць камфортны мікраклімат, ачышчаючы паветра і насычаючы яго кіслародам. Але многія дэкаратыўныя расліны могуць хаваць у сабе небяспеку.

Купляючы пакаёвую кветку, мы часам нават не можам сабе ўявіць, што яна здольная стаць прычынай праблем са здароўем, аднак такое здараецца. Дастаткова зазірнуць на форумы аматараў дамашняга кветкаводства — там дадзеная тэма абмяркоўваецца часта.

«У майго дзіцяці моцная алергія на цвіценне расліны хойя. Расліна становіцца прычынай праблем, толькі калі зацвітае. Днём яшчэ нічога, а ўвечары яна пачынае мацней пахнуць. У дзіцяці чырванеюць вочы, з'яўляецца моцны насмарк. Доўга не маглі зразумець, на што такая страшная алергія. Потым прыбралі з дома гэтую кветку — і праблема сышла».

«Я аднойчы вырашыла размножыць малачай, пачала адломліваць галінку, і сок пырснуў мне ў вока. Справа скончылася ў афтальмалагічным аддзяленні бальніцы. Дачка кветку адразу ж выкінула».

«У нас загінула кошка пасля таго, як пагрызла лісце. Ніколі не падумала б на спацыфілум!»

То-бок, калі ў вашым доме ёсць дзеці, хатнія жывёліны і пажылыя людзі — выбірайце дэкаратыўныя расліны ўважліва. Большасць з іх першапачаткова — насельнікі трапічных шырот. Прычым ядавітымі спецыялісты называюць нават некаторыя з самых распаўсюджаных пакаёвых раслін, якія стагоддзямі людзі вырошчваюць у сваіх дамах. Пра тое, з якімі «кветачкамі» лепш быць «на вы», мы спыталі ў **загадчыцы лабараторыі аранжарэйных раслін Цэнтральнага батанічнага сада НАН Беларусі Ганны ШУТАВАЙ.**

ЯК НЕ «АБ'ЕСЦІСЯ БЛЁКАТУ»

Пачнём з раслін, непажаданых у дамах з маленькімі дзецьмі і хатнімі гадаванцамі. Сок гэтых раслін можа выклікаць атручэнне ці апёк. Калі «групы рызікі» ў вашым доме няма — усе дарослыя і свядомыя — і ў гэтым выпадку не перашкодзяць меры засцярогі: перасаджванне ў пальчатках і дбайнае мыццё інструментаў, якія выкарыстоўваліся пры рабоце з імі. І, вядома, не варта абразаць іх кухонным нажом або нажніцамі, што неабходныя вам для іншых патрэб.

— Перш за ўсё, набываючы пакаёвую кветку, удакладніце, да якога сямейства яна належыць, — раіць Ганна Генадзеўна. — Гэта далёка не лішняя інфармацыя. Найбольш ядавітыя сярод папулярных дэкаратыўных хатніх раслін адносяцца да чатырох сямействаў. Гэта сямейства малачаевых (сок яго прадстаўнікоў здольны выклікаць апёкі на скуры), сямейства ароідных (вылучаюць таксіны), сямейства кутравых (небяспечныя для жыцця жывёлін, чалавек таксама можа атруціцца — так што пальчаткі пры рабоце з імі абавязковыя) і сямейства паслёнавых. Калі казаць аб гэтым апошнім сямействе, то небяспечныя для здароўя чалавека далёка не ўсе яго прадстаўнікі. Да паслёнавых, напрыклад, адносяць бульбу або баклажан. Але менавіта дэкаратыўныя расліны гэтага сямейства могуць стаць прычынай праблем — іх плады здольныя выклікаць сур'ёзнае атручэнне, ваніты і парушэнні страваванне.

Дарэчы, да паслёнавых належыць і **блёкат**, што ўвайшоў у прымаўку. Менавіта сокам блёкату ў знакамітым творы Шэкспіра атруцілі бацьку Гамлета. На шчасце, блёкат дома ніхто не вырошчвае. Але ёсць нямала іншых небяспечных раслін, якія ў пагоні за прыгажосцю можна пасяліць у сваім жыллі. Напрыклад, той жа малачай (або багаткі).

— Гэта вялікі род раслін, які адносіцца да сямейства малачаевых, што ўключае каля 2000 прадстаўнікоў. З іх больш за 30 можна вырошчваць у памяшканнях і далёка не ўсе яны па-сапраўднаму небяспечныя, — адзначае суразмоўніца.

Таксічныя рэчывы, якія змяшчаюцца ў лістоце і сцёблах плюшчу, здольныя выклікаць парушэнні нервовай дзейнасці аж да паралічу, а таксама парушэнне работы сардэчна-сасудзістай сістэмы гадаванца.

У хатнім кветкаводстве распаўсюджаныя віды, падобныя на маленькую пальму (белажылістыя і грабяністыя багаткі). А таксама малачай Міля. Белаваты густы сок гэтых раслін, трапляючы ў арганізм, здольны выклікаць атручэнне, скурны сверб і раздражненне або алергічную рэакцыю. Ядавітае таксама насенне, так што і дарослым не пашкодзяць пальчаткі пры рабоце з ім.

— Да сямейства малачаевых належыць і іншы род, кратон, самы вядомы прадстаўнік якога, **кадзіеум стракаты**, незвычайна прывабны вонкава. Аднак і ён утрымлівае ядавіты млечны сок, пры пападанні якога ў кроў (напрыклад пры парэзах) рэакцыя бывае настолькі моцнай, што справа можа скончыцца нават бальніцай. Сямейства ароідных уключае як расліны, якія складаюць небяспеку з-за млечнага соку з алкалоідамі і цыяністымі злучэннямі, што змяшчаюцца ў лісці і парастках (дыфенбахія), так і з-за соляў шчаўевай кіслаты (аксалатаў), якія выклікаюць раздражненні, атручэнні і ваніты пры пападанні ўнутр, як у **алаказіі, філадэндра, аглаанемы, каладзіума, антурыума.**

ПЕРАЛІЧЫМ ПА ІМЁНАХ

Дыфенбахія — вельмі распаўсюджаная ў пакаёвым кветкаводстве расліна. Валодае прыгожым рознакаляровым (жоўта-зялёным) лісцем.

Буйная крона выглядае вельмі дэкаратыўна. Але калі ваш кот (або малы, які толькі пачаў поўзаць) вырашыць паспрабаваць на смак сакавітыя лісцікі, моцнага атручэння не пазбегнуць. Сок расліны выклікае млоснасць, ваніты, галавакружэнне. А пры пападанні на скуру — наймацнейшы апёк і раздражненне.

Манстэру, напэўна, бачылі ўсе — яна сустракаецца ў розных установах і часам нават у паліклініках. Шчыльнае буйное лісце з разрэзамі па краях выглядае эфектна. Пры гэтым сок расліны можа стаць прычынай хімічнага апёку скуры і нанесці шкоду здароўю.

— Наогул, манстэру толькі ўмоўна адносяць да небяспечных раслін, і ўсё ж дома яе лепш не заводзіць, калі вы баіцеся за хатніх гадаванцаў, — падкрэслівае загадчыца лабараторыі аранжарэйных раслін ЦБС.

Антурыум — яшчэ адна модная цяпер пакаёвая расліна. Яго не толькі вырошчваюць дома, але і прадаюць у букетах. Антурыум лічыцца «мужчынскай кветкай» — калі вы выбіраеце букет, напрыклад для юбіляра-мужчыны, вам абавязкова прапануюць антурыум.

Строгі і накіраваны ўверх, ён сапраўды выглядае шляхетна. Але яго сок ядавіты — можа выклікаць як апёк слізістай, так і алергічную рэакцыю, асабліва пры глытанні кавалачка ліста або пялёстка дзецьмі ці хатнімі жывёламі.

Алеандр, прадстаўнік сямейства кутравых, сёння папулярны ў аматараў пакаёвага кветкаводства — яго цэняць за пышнае цвіценне і яркія малінава-чырвоныя кветкі.

Трапленне соку гэтай расліны, які змяшчае небяспечныя гліказіды, у арганізм можа выклікаць слепату. Больш таго, нават пах гэтай расліны правакуе ў некаторых людзей галавакружэнне і пагаршэнне самаадчування.

Адэніум — эфектная расліна, што таксама адносіцца да кутравых: маленькае дрэўца з тоўсценькім ствалом, а лісты і кветкі размешчаны на яго верхавіне. Расліна вельмі таксічная, і асабліва — яе сок, які можа стаць прычынай наймацнейшых атручэнняў.

— Яшчэ адзін прывабны і вельмі ядавіты член сямейства — **плюмерыя**. У яе кары прысутнічаюць ірыдоіды, якія выклікаюць паражэнне страўнікава-кішачнага тракта. Сок расліны можа выклікаць раздражненне скуры і слізістых абалонак рота, калі пражаваць часткі расліны.

Вечназялёны **плюшч**, прадстаўнік сямейства араліевых, цалкам мог бы заслужыць мянушку «каціная смерць».

Чароўная ліяна з яркім зялёным лісцем прыцягвае хатніх кошак.

Між тым нароўні з моднымі цяпер **полісцыасам** і **фатсіяй** вечназялёны плюшч асабліва небяспечны для катоў і грызуноў.



Таксічныя рэчывы, якія змяшчаюцца ў лістоце і сцёблах плюшчу, здольныя выклікаць парушэнні нервовай дзейнасці аж да паралічу, а таксама парушэнне работы сардэчна-сасудзістай сістэмы гадаванца. Не рэкамендуецца вырошчваць гэтыя расліны і ў доме, дзе ёсць маленькія дзеці.

Азалія ўваходзіць у лік самых вядомых і папулярных дэкаратыўных гаршковых раслін. Існуюць дзясяткі сартоў азаліі — з далікатна-ружовымі і белымі кветкамі, а таксама яркімі, у чырвонай і жоўтай колеравай гаме. Калі ўжо ўпрыгожваць азаліяй свой дом, то трэба ведаць: найбольш небяспечная для здароўя азалія індыйская — калі яе сок трапляе ў арганізм, магчымыя курчы і кішэчныя колікі з-за наяўнасці ядавітага гліказіду — андрамедатаксіну.

Існуе і яшчэ адна дэкаратыўная расліна — **ліснік** (або паслён) — якая вабіць малых і хатніх жывёл сваімі пладамі. Ярка-аранжавыя ягадкі ўпрыгожваюць вечназялёны куст і нібы просяцца паспрабаваць іх на смак. Але яны ядавітыя.

А вось **мімоза сарамлівая**, лічыцца, у стане выклікаць аблысенне — расліна вылучае таксіны, якія спрыяюць выпадзенню валасоў.

Пры гэтым яна вельмі прыгожая і пацешная: далікатныя лісцікі пры дакрананні згортваюцца ў трубачку. І іх так і хочацца пакратаць.

Фікус — так-так, і ён, стары сябар і добры знаёмец, можа складаць небяспеку. Фікус небяспечны для алергікаў: яго сок — наймацнейшы алерген. Таму непажаданы кантакт з пашкоджанымі сцёбламі або лісцем фікуса.

Амарыліс — любімая расліна нашых бабуль, што радуе чырвонымі ці белымі буйнымі кветкамі-грамафонамі зімой і ранняй вясной, утрымлівае ядавітае злучэнне лікарын, якое выклікае ваніты і дыярэю.

З самых вядомых пакаёвых раслін шкоду «гаспадару» і яго сям'і можа нанесці таксама і **прымула**. Таксічныя рэчывы, якія выдзяляюцца ёю пры цвіценні, здольныя выклікаць апёкі скуры і слізістых, галавакружэнне і млоснасць. Прымулу любяць не толькі за пышнае красаванне (сартоў гэтых дэкаратыўных кветак сёння існуюць сотні), але і за чароўныя аксамітныя лісцікі, якія хочацца пагладзіць. Аднак кантакт з варсінкамі таксама прыводзіць да алергічных рэакцый.

І, нарэшце, **трыхацэрэус** — адзін з прадстаўнікоў кактусаў. Кактусы выклікаюць

Калі ў вашым доме ёсць дзеці, хатнія жывёліны і пажылыя людзі — выбірайце дэкаратыўныя расліны ўважліва. Ядавітымі спецыялісты называюць нават некаторыя з самых распаўсюджаных пакаёвых раслін, якія стагоддзямі людзі вырошчваюць у сваіх дамах.

замілаванне, у іх тысячы фанатаў па ўсім свеце. Штогод праводзіцца Сусветны кангрэс аматараў кактусаў, а калекцыі сур'ёзных «кактусаманаў» складаюцца з сотняў асобін. Існуе меркаванне, што кактусы бяспечныя для хатняга вырошчвання. Між тым трыхацэрэус — ядавіты. У складзе яго соку і мякаці ёсць галюцынагены, здольныя выклікаць збой работы нервовай сістэмы.

ДЗЕ «ПАСЯЛІЦЬ» КВЕТКУ?

Ёсць пакаёвыя расліны, якія могуць быць небяспечныя, толькі калі «пасяліць» іх няправільна.

— Калі грунтавацца на навуковых даных, а не на розных забабонах, неспрыяльнае ўздзеянне раслін на адлегласці можа быць абумоўлена высокім утрыманнем лятучых арганічных злучэнняў, якія некаторыя расліны вылучаюць у паветра, — кажа Ганна Шутава. — Такія рэчывы могуць быць карысныя, валодаць, напрыклад, фітанцыдным дзеяннем. Аднак некаторыя з лятучых рэчываў могуць выклікаць і негатыўны эфект, асабліва ў маленькіх дзяцей, людзей з хранічнымі захворваннямі або аслабленым імунітэтам.

Лілеі ў гаршчках, напрыклад, не варта размяшчаць у пакоі, дзе чалавек спіць. Іх моцны водар можа выклікаць бяссонніцу або галаўны боль.

Любімая многімі **архідэя** таксама будзе лішняя побач з вашым ложкам: расліна вылучае рэчывы, што ўзбуджаюць нервовую сістэму. А вось на рабочым стале яна якраз дарэчы — падоруць бадзёрасць.

Упадабаная кветкаводамі **тубероза** вылучае рэчывы, якія абвастраюць нюх. Наўрад ці ёй месца ў спальні або на кухні — лепш пасяліць яе ў гасцінай, якая добра праветрываецца. Акрамя таго, тубероза супрацьпаказаная людзям з гіпертаніяй або кардыялагічнымі праблемамі — у гіпертонікаў яна выклікае галавакружэнне.

Дзіяна РОНІНА.

Храмы маёй радзімы

Касцёл св. Андрэя, г. Слонім

ЯК ФЕНІКС З ПОПЕЛУ...

Ад рэдакцыі. *Аўтар гэтага артыкула — гісторык, пісьменнік, журналіст Мікола Багадзяж, з якім вы неаднойчы сустракаліся на старонках нашай газеты, чые кнігі выходзілі ў Выдавецкім доме «Звязда». Мікола рыхтаваў матэрыял адмыслова для гэтай рубрыкі, але, на жаль, не паспеў яго скончыць... Тым не менш напісана было дастаткова, каб атрымаўся цэласны і вельмі цікавы твор — яго падрыхтавала да друку сааўтар Міколы, яго жонка, таксама гісторык і пісьменніца Ірына Масляніцына. Такім чынам, прапануем вашай увазе апошні артыкул Міколы Багадзяжа, які гучыць як запавет слыннага гісторыка. А таксама раім звярнуць увагу на кнігу Міколы Багадзяжа і Ірыны Масляніцынай «Легендарныя героі беларускай гісторыі XI — XIX стст.», якую яшчэ можна набыць.*

Слонімскі касцёл святога Андрэя... Наша першае спатканне з ім адбылося ў далёкіх ужо 1980-х, у мае студэнцкія гады, калі трапіў у Слонім на вайсковыя зборы.

Касцёл святога Андрэя месціцца даволі далёка ад цэнтра горада, і таму, вывучаючы наваколле, дабраўся да яго я даволі позна. Вось дзе па-сапраўднаму зашчымела сэрца...

Яшчэ і ў канцы 1980-х гадоў без шкадобы глядзець на яго было немагчыма. Паабдзіраныя мураваныя сцены, праём без дзвярэй, слабае рассеянае святло, якое трапляе ўнутр не столькі праз забітыя дошкамі вокны, колькі скрозь дзіркі ў даху. Дакладней, у яго рэштках. Кучы смецця, абломкі цэглы і шмат нечага брудна-белага (размоклай ад дажджоў і вільгаці калійнай солі). А над галавою лапатанне крылаў і гурканне галубоў, якія засялілі руіны.

Але нягледзячы на гэта, збудаванне не падавалася спарахнелым. Яно ўражвала сваёй узвышанай прыгажосцю, веліччу, магутнасцю. Было падобным да зраненага ў бітвах састарэлага воіна, які настойліва змагаецца за жыццё, павольна, патроху саступаючы непазбежнасці...

Дзеці з найбліжэйшай школы на перапынках бегалі да руінаў гуляць у хованкі і казакоў-разбойнікаў. Больш рамантычныя натуры, як мая Ірына, шукалі скарбы і падземныя хады, расказвалі адно аднаму таямнічыя гісторыі пра труны, якія лётаюць, маўляў, па касцёле ноччу; пра таямнічыя галасы даўно сышоўшых у нябыт святароў, манахаў і міран. А кіроўцы грамадскага транспарту выкарыстоўвалі руіны ў якасці прыбіральні, бо касцёл знаходзіўся якраз на канцавым прыпынку.

Казалі, што храм аднавіць ужо немагчыма, што ён хутка абваліцца, і дзеля таго каб пазбегнуць выпадковых ахвяр, варта знесці яго наогул. Але зрабіць гэта перашкаджала сціплая шыльдачка: «Помнік архітэктуры. Ахоўваецца дзяржавай».

Ці не ў той час я даў сам сабе слова: зрабіць усё магчымае, каб уратаваць святыню ад канчатковага разбурэння — я ж вучыўся на гістарычным факультэце. І быў актыўным максімалістам паўсюль, дзе гаворка заходзіла пра захаванне беларускай спадчыны і адраджэнне яе аб'ектаў. Я сумленна выканаў зарок: больш за два дзясяткі артыкулаў пра слонімскага «Андрэя» за маім подпісам з'явілася ў розны час у рэспубліканскіх выданнях. Распавядаючы багатую гісторыю святыні, я настойліва заклікаў грамадскасць звярнуць увагу на яе стан і пачаць адраджэнне. Кроплі тачаць камяні, і кожны такі заклік, я веру, памалу мяняе стаўленне людзей да ўласнай гісторыі. І, пэўна, мой удзел у тым, што касцёл святога Андрэя ў рэшце рэшт адрадзіўся, таксама ёсць. Ва ўсякім разе, мне хочацца так думаць.

Храм пастаў з руін толькі ў 1990-х гадах. Цяпер гэта — ледзь не галоўны аб'ект паломніцтва турыстаў, якія прыязджаюць у Слонім.

Сапраўды, у храма найбагацейшая гісторыя. Упершыню на тым месцы касцёл быў узведзены ў 1490 годзе сынам польскага караля Ягайлы, Казімірам. Гэта была драўляная пабудова. Неаднаразова храм гарэў. Разбураўся, аднак вернікі кожны раз зноў узводзілі яго. Сярэдневяковы Слонім быў важным палітычным і духоўным цэнтрам Вялікага Княства Літоўскага. Нядзіўна, што сюды ў розны час завітвалі многія аўтарытэтныя каталіцкія прапаведнікі. І нават праслаўлены Пётр Скарга, вялікі руплівец хрысціянства, міратворац у справах дзяржаўнай палітыкі, прызнаны вучоны-тэолаг і духоўнік каралеўскай сям'і. Яны вялі набажэнствы і прапаведавалі ў сценах касцёла святога Андрэя.

Пасля чарговага разбурэння ў XVIII стагоддзі ўладальнік Слоніма граф Міхал Казімір Агінскі ў 1775 годзе фінансаваў будаўніцтва новага мураванага касцёла. І майстры-будаўнікі пастараліся. Узвялі храм, які адразу ж стаў найлепшым упрыгажэннем і гонарам горада. Праз дваццаць пяць гадоў, згодна з апошняй воляй Агінскага, сэрца яго было замуравана ў адну са сцен храма. Ці не гэта ўратавала сцены святыні ад канчатковага разбурэння?

У XIX і XX стагоддзях вакол храма палыхалі паўстанні і войны. Мянялася ўлада ў горадзе і дзяржаве. А касцёл кожны дзень з году ў год збіраў у сваіх сценах парафіян, склікаючы іх сваім звонам, накіроўваючы думкі да ўзвышанага арганнай музыкай. Словамі святароў, якія служылі тут, заклікаў людзей любіць блізкіх сваіх, берагчы адно аднаго, утрымліваць сумленне сваё ў чысціні.

Касцёл быў закрыты ў часы ваяўнічага атэізму ўжо пасля Другой сусветнай вайны. Некаторы час будынак прастаяў без прымянення і без нагляду. Потым камусьці з «руплівых» кіраўнікоў прыйшло ў галаву ператварыць «нікому не патрэбнае збудаванне» ў склад калійнай солі...

З якога боку на гэта ні глянуць, ідэя была дрэннай. Пад дахам, які прыпадобніўся рэшату, соль хутка скамянела і ператварылася ў суцэльны маналіт. Павазіліся з ім трохі, пакорпалі з краёчку, ды і спісалі на «стыхійнае бедства». З тых часін гарадскія ўлады касцёлам перасталі цікавіцца. Злашчаснага «Андрэя» разбуралі дажджы і салявыя выпарэнні.

Праўда, трэба быць сумленнымі, час ад часу пытанне пра магчымасць рэстаўрацыі ўзнімалася, у асноўным «нефармаламі-патрыётамі». Гэта менавіта яны дабіліся «ў вярхах», каб касцёл быў уключаны ў «Звод помнікаў гісторыі і культуры» як помнік архітэктуры. А супрацоўнікі Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі і атэізму нават збіраліся на свае сродкі адрэстаўраваць храм і стварыць у ім свой філіял. Цудоўная ідэя! Але ў той час кіраўніцтва горада наадрэз адмовіла музейшчыкам.

А потым сталася сапраўдная крымінальная гісторыя. Сярод белага дня з фасадаў Святога Андрэя невядомыя знялі метровыя драўляныя статуі апосталаў і вывезлі іх са Слоніма. І гэты крадзеж выявіўся не адразу. Сведкі падзей, простыя гараджане, думалі, што ўсё робіцца з ведама і адабрэння «вялікіх начальнікаў». А «вялікія начальнікі» са здзіўленнем заўважылі, што касцёл стаіць без статуй ужо толькі тады, калі шум узнялі заезджыя турысты. Міліцыя завяла крымінальную справу, але зусім безнадзейна: як і дзе шукаць выкрадальнікаў, што прыехалі на машыне з літоўскімі нумарамі, ніхто не ведаў.

Аднак крадзеж ясна паказаў — касцёл і сам па сабе, і ў дэталях з'яўляецца каштоўнасцю. Пэўна, менавіта нахабны і дзёрзкі гэты крадзеж і падштурхнуў далейшыя, вельмі спрыяльныя для храма падзеі. Мясцовы ксёндз Вітольд Жыльветра арганізаваў вернікаў, і яны ў свой вольны час сталі прыходзіць да касцёла і працаваць. Выграблі паўтараметровы слой солі, цаглянай крошкі, птушыных экскрэментаў і смецця. Неўзабаве і гарадскія ўлады пайшлі насустрач вернікам. Касцёл было вырашана ўрэшце вярнуць абшчыне.

Цяпер трэба было вызначыцца наконт уласна рэстаўрацыі і абраць спецыялістаў. Ксёндз настойваў на тым, што храм мусіць

Вернікаў чакаў яшчэ адзін удар. Спецыялісты «Белрэстаўрацыі», якія па заказе гарвыканкама правялі абследаванне касцёла, далі заключэнне, што для аднаўлення «Андрэя» трэба поўнасцю разабраць яго, а потым будаваць наноў (як Траецкае прадмесце ў Мінску). Маўляў, соль і вільгаць сваю справу зрабілі. Структура камянёў разбурана.

Даведаўшыся пра такі прысуд і пра прыкладны кошт будучых работ, усе ўстановы і арганізацыі, якія заяўлялі пра сваю гатоўнасць узяцца за рэстаўрацыйныя работы, адмовіліся ад ідэі. Давялося запрашаць іншага спецыяліста, які даследаваў касцёл і ўстанавіў, што разбураць яго няма патрэбы. Трохі пазней ён даслаў сваё заключэнне і рэкамендацыі.

Айчынным рэстаўратарам давялося згадзіцца з гэтым заключэннем. Яны паставілі (ды і тое толькі з дапамогай вернікаў) рыштаванні вакол храма і... зніклі. Над касцёлам павісла пагроза ператварыцца ў чарговы рэстаўрацыйны даўгабуд. Аднак людзей гэта не задавальняла. Яны настойвалі на правядзенні работ.

У рэшце рэшт у красавіку 1991 года было прынята рашэнне аб перадачы забудовы каталіцкай абшчыне. І адразу ж усё змянілася. З'явіліся і грошы, і будматэрыялы. Праўда, насцярожвалі планы рэстаўратараў. Яны разлічвалі, што работы расцягнуцца гадоў на 10-15.

Аднак ксёндз увёў своеасаблівы акордна-прэміяльны падрад. Ставіў перад рабочымі задачу, назначаў тэрмін выканання. І папярэджваў, што калі яна з любых прычын будзе выканана пазней хоць бы на дзень-два, то і зарплата стане ў два-тры разы меншай. І што вы думалі? Справа пайшла. Дапамагалі рэстаўрыраваць касцёл і самі сланімчане. Кожны дзень на будоўлю прыходзіла чалавек з дзесяць. А на суботнікі — па сорак-пяцьдзясят. Потым быў здзейснены роспіс купала, сцен. Фрэскі аднаўляліся дзякуючы фотаздымкам, якія захаваліся ў архівах. Толькі ў двух месцах пэндзаль мастака не крануў паверхні — там, дзе цудам захаваліся невялічкія фрагменты старога роспісу.

І храм паўстаў, бы фенікс з попелу. Сёння сланімчане і наведвальнікі Слоніма могуць убачыць касцёл святога Андрэя менавіта такім, якім бачылі яго людзі ў 40-х гадах XX стагоддзя. І апосталы вярнуліся ў свае нішы на фасадзе, адшуканыя нераўнадушнымі людзьмі і адабраныя ў выкрадальнікаў. Гісторыя ўратавання храма, які стаў часткай маёй асабістай духоўнай прасторы, аказалася са шчаслівым канцом. Каб жа гэтак пашанцавала ўсім нашым храмам, палацам бы панскім сядзібам, якія сёння яшчэ ставяць у руінах і чакаюць свайго часу!

Мікола БАГАДЗЯЖ.

Шляхі «Дарогі да святыняў»

XXIX Міжнародная навукова-асветніцкая экспедыцыя наведае мясціны, знакавыя для нашай гісторыі

Дзень беларускага пісьменства нельга ўявіць без аднаго з галоўных яго складнікаў — Міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў» з Жыватворным Агнём ад Гроба Гасподняга. Сёлета яна пройдзе па новым маршруце і завершыцца ў горадзе Добрушы на галоўных урачыстасцях штогадовага свята.

ГЭТЫМІ днямі ініцыятыўная група ўдзельнікаў пабывала ў гарадах і вёсках Гомельскай вобласці, якія экспедыцыя наведае на сваім шляху. На сустрэчах з кіраўніцтвам раёнаў, прадстаўнікамі праваслаўнай царквы, мясцовымі краязнаўцамі былі ўдакладнены месцы і час правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў, сумесных богаслужэнняў, навукова-творчых канферэнцый, гутарак, выставак матэрыялаў папярэдніх экспедыцый.



Асаблівую ўвагу экспедыцыі будуць прыцягваць мясціны, звязаныя са знакавымі падзеямі ў нашай гісторыі. Памяць пра мінулае стане галоўнай тэмай выступленняў вядомых навукоўцаў, літаратараў — яны, як і ў мінулыя гады, разам з усімі ўдзельнікамі вандроўкі будуць несці лампаду з Жыватворным Агнём ад Гроба Гасподняга.

Гэты фотарэпартаж зроблены ў Жыткавіцкім раёне. Ініцыятыўная група пабывала ў аграгарадку Ленін. Вёска з такой назвай упершыню згадвалася тут у 1568 годзе. Мясцовыя жыхары захоўваюць і перадаюць наступным пакаленням памяць пра мноства падзей з гісторыі свайго краю. Самымі змрочнымі былі часы, калі сюды ўварваліся фашысцкія акупанты. Надпісы, якія нагадваюць пра гады Вялікай Айчыннай вайны, можна ўбачыць тут на многіх помніках. А яшчэ на граніце гэтых помнікаў нанесены трагічныя лічбы колькасці ахвяр ваеннага ліхалецця: мірных вяскоўцаў і ваеннапалонных чырвонаармейцаў. У ходзе карных аперацый захопнікі знішчылі будынак мясцовай царквы (быў заснаваны ў 1788 годзе).

Ініцыятыўная група пабывала ў месцах трагічных падзей, агледзела помнікі, завітала ў новую вясковую царкву, паслухала расповед пра мінулае ад мясцовага жыхара, былога настаўніка беларускай мовы і літаратуры Васіля Вярэніча. У Ленінскім сельскім Доме культуры адбылася сустрэча з вяскоўцамі, на якой выступілі пісьменнікі — удзельнікі экспедыцыі. Была паказана рэтраспектыўная выстаўка фотаздымкаў з папярэдніх экспедыцый, зробленых фотакарэспандэнтам газеты «Звязда» Яўгенам Пясецкім (ён удзельнічаў ва ўсіх папярэдніх дваццаці васьмі экспедыцыях). Такая ж сустрэча з жыхарамі прайшла і ў Жыткавічах, у зале раённай бібліятэкі.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Жывыя традыцыі

Вышытыя сімвалы

У Нацыянальным гістарычным музеі пачала работу часовая выстаўка «Вышыўка. З калекцыі Алены Іванаўны Дубініч». Што ў ёй цікавага і чаму яе варта наведаць?

Аснову экспазіцыі складаюць ручнікі і серыя вышытых работ «Сталіцы рэспубліканскіх «Дажынак» (1996—2013)». Ручнікі — увогуле прадмет асаблівага захаплення Алены Дубініч. Майстрыха нават выдала кнігу «Беларускі ручнік. З мінулага ў дзень сённяшні», у якой сабрала інфармацыю аб вырабленых ёю ручніках (апошняя таксама прадстаўлена на экспазіцыі). Майстрыха перакананая, што ручнікі — больш чым прыгожыя рамесныя вырабы, бо, каб зрабіць сапраўдны абрадавы атрыбут, неабходна выканаць цэлы шэраг правілаў.

Ці ведалі вы, напрыклад, што вясельныя ручнікі нельга вышываць ноччу і што іх палатно павінна быць цэльным, без карункаў і тасьмы пасярэдзіне? «Гэтым вы

толькі нашкодзіце, разрэзанае жыццё не сшыеш, як бы ні стараўся», — піша ў сваёй кнізе Алена Дубініч. А яшчэ на вясельных ручніках не вышываюць зязюль і салаўёў (першыя з'яўляюцца сімвалам удоў, другія — халасцякоў). Пасля цырымоніі ручнік абавязкова захоўваецца ў сям'і ў скручаным выглядзе, да таго ж яго нікому нельга пазычаць (бо лёс не складзецца).

Асабліва ўразіў ручнік з вышытымі ластаўкамі і рабінай. Як аказалася, ён — пад каравай. Алена Дубініч піша, што такія ручнікі не абмежаваныя ў выбары ўзораў. Хочаш — карункамі ўпрыгожвай, хочаш — кветкамі і пажаданнямі або птушкамі. Але тут трэба заўважыць, што птушкі абавязкова павінны цалавацца. І ніякіх зязюль і салаўёў! А вось вышытыя выявы ластавак, сокалаў, пеўняў, індыкоў і паўлінаў — калі ласка.

Яшчэ цікавая гісторыя ў ручніка, прызначанага для звязвання рук маладым. Сімвалы ў першым радку — дарога да вянчання. У другім — працэс абраду. Трэці рад азначае моцную сям'ю. А цацвёрты змяшчае «дрэва жыцця», на якім мы бачым не толькі маладую пару, але і іх дзяцей.

Трэба адзначыць, што на гэтай выстаўцы можна ўбачыць таксама два запатэнтаваныя сувенірныя ручнікі — «Мінск» і «Нясвіж». На іх вышытыя гербы гарадоў, стылізаваная народная сімволіка і арнамент, які адпавядае гісторыі канкрэтнай мясцовасці.

Наведаць выстаўку можна да 7 жніўня.

Лізавета ГОЛАД.

Ручнік «Для звязвання рук маладым».

Ручнік «Пад каравай».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ ТОРГОВ

Организатор торгов	**Антикризисный управляющий Открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО» – ООО «Антикризисное управление», 220012, Минск, ул. Чернышевского, д. 5, офис 4, сектор «Б»**
Продавец	**ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 17 298-14-22)**

Торги проводятся в форме открытого аукциона отдельными лотами на повышение стоимости с открытой формой предложения

Сведения о предмете торгов и начальной цене

Дебиторская задолженность:

Лот № 7: Потребительский кооператив «АВТОСТОЯНКА «СЕРЕБРЯНКА-8» (УНП 101064304) на сумму 1 833,94 руб., начальная цена – 18,34 руб.;

Лот № 19: Общество с ограниченной ответственностью «АРЛЕКС» (УНП 100422074) на сумму 129,03 руб., начальная цена – 1,29 руб.;

Лот № 22: Общество с ограниченной ответственностью «АРЛЕКС» (УНП 100422074) на сумму 873,74 руб., начальная цена – 8,74 руб.;

Лот № 23: Общество с ограниченной ответственностью «АРЛЕКС» (УНП 100422074) на сумму 152,32 руб., начальная цена – 1,52 руб.;

Лот № 24: Общество с ограниченной ответственностью «АРЛЕКС» (УНП 100422074) на сумму 198,38 руб., начальная цена – 1,98 руб.;

Лот № 25: Общество с ограниченной ответственностью «АРЛЕКС» (УНП 100422074) на сумму 32,29 руб., начальная цена – 0,32 руб.;

Лот № 26: Общество с ограниченной ответственностью «АРЛЕКС» (УНП 100422074) на сумму 885,36 руб., начальная цена – 8,85 руб.;

Лот № 27: Общество с ограниченной ответственностью «АРЛЕКС» (УНП 100422074) на сумму 197,87 руб., начальная цена – 1,98 руб.;

Лот № 28: Общество с ограниченной ответственностью «АРЛЕКС» (УНП 100422074) на сумму 19,34 руб., начальная цена – 0,19 руб.;

Лот № 29: Общество с ограниченной ответственностью «АРЛЕКС» (УНП 100422074) на сумму 228,76 руб., начальная цена – 2,29 руб.;

Лот № 30: Общество с ограниченной ответственностью «АРЛЕКС» (УНП 100422074) на сумму 140,53 руб., начальная цена – 1,41 руб.;

Лот № 31: Общество с ограниченной ответственностью «АРЛЕКС» (УНП 100422074) на сумму 188,16 руб., начальная цена – 1,88 руб.;

Лот № 40: Белорусско-итальянское совместное предприятие общество с ограниченной ответственностью «БЕЛКАСТЕЛЬПЛАСТ» (УНП 100369200) на сумму 11 658,00 руб., начальная цена – 116,58 руб.;

Лот № 57: БУГРОВ И.А. ИП (УНП 193085667) на сумму 2 403,93 руб., начальная цена – 24,04 руб.;

Лот № 58: БУГРОВ И.А. ИП (УНП 193085667) на сумму 745,72 руб., начальная цена – 7,46 руб.

Лот № 68: Общество с ограниченной ответственностью «Воркгрупп АДВ» (УНП 192966911) на сумму 4 588,94 руб., начальная цена – 45,89 руб.;

Лот № 69: Общество с ограниченной ответственностью «Воркгрупп АДВ» (УНП 192966911) на сумму 838,99 руб., начальная цена – 8,39 руб.;

Лот № 70: Общество с ограниченной ответственностью «Воркгрупп АДВ» (УНП 192966911) на сумму 4 480,88 руб., начальная цена – 44,81 руб.;

Лот № 71: Общество с ограниченной ответственностью «Воркгрупп АДВ» (УНП 192966911) на сумму 1 079,29 руб., начальная цена – 10,79 руб.;

Лот № 87: Общество с ограниченной ответственностью «Интерметехник» (УНП 790303647) на сумму 243,79 руб., начальная цена – 2,44 руб.;

Лот № 89: Общество с ограниченной ответственностью «ИрмисТрейд» (УНП 590359496) на сумму 94,19 руб., начальная цена – 0,94 руб.;

Лот № 119: ПАНФИЛОВ ВЯЧЕСЛАВ СЕРГЕЕВИЧ на сумму 66,72 руб., начальная цена – 0,67 руб.;

Лот № 125: Общество с ограниченной ответственностью «ПетраКолор» (УНП 691074283) на сумму 37,36 руб., начальная цена – 0,37 руб.;

Лот № 127: Закрытое акционерное общество «МВЗ Промет» (УНП 191118452) на сумму 737,03 руб., начальная цена – 7,37 руб.;

Лот № 128: Закрытое акционерное общество «МВЗ Промет» (УНП 191118452) на сумму 3 267,70 руб., начальная цена – 32,68 руб.;

Лот № 137: Общество с ограниченной ответственностью «СИСТЕМЫ ИНВЕСТИЦИЙ И ИННОВАЦИЙ ПЛЮС» (УНП 192519246) на сумму 109,20 руб., начальная цена – 1,09 руб.;

Лот № 141: Научно-производственное общество с ограниченной ответственностью «Строительно-монтажное предприятие-25» (УНП 490451346) на сумму 18,14 руб., начальная цена – 0,18 руб.;

Лот № 144: СУКАЛО АЛЕКСАНДР ВЛАДИМИРОВИЧ ИП (УНП 193455819) на сумму 142,37 руб., начальная цена – 1,42 руб.;

Лот № 145: СУКАЛО АЛЕКСАНДР ВЛАДИМИРОВИЧ ИП (УНП 193455819) на сумму 60,98 руб., начальная цена – 0,61 руб.;

Лот № 146 СУКАЛО АЛЕКСАНДР ВЛАДИМИРОВИЧ ИП (УНП 193455819) на сумму 802,85 руб., начальная цена – 8,03 руб.;

Лот № 150: Частное сервисное унитарное предприятие «Термофлай» (УНП 192270825) на сумму 4,41 руб., начальная цена – 0,04 руб.;

Лот № 151: Частное сервисное унитарное предприятие «Термофлай» (УНП 192270825) на сумму 145,59 руб., начальная цена – 1,46 руб.;

Лот № 164: Общество с ограниченной ответственностью «Халенгер» (УНП 812006365) на сумму 627,72 руб., начальная цена – 6,28 руб.;

